Страх у Гайнаўцы ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Лука ☞ 8

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 02 (2748) Год LIV | Беласток, 11 студзеня 2009 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

У пошуках Менску

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

Ах, той Мінск... Кожны раз падаюся ў гэты не так аддалены горад з нейкай надзеяй, але калі задумацца з якой, я не ў змозе адказаць. Тэкст Лявона Вольскага „Менск і Мінск" кожны раз прымушае задумацца колькі Менску зараз у Мінску, колькі цукру ў цукры, як сказаў бы герой польскай кінакамедыі Станіслва Барэі „Пошуківаны, пошуківана" („Той, якога шукаюць, тая, якой шукаюць"). А што спалучае Менск і цукар? Тым, якія едуць упершыню, напэўна гэта асацыюецца з самагонкай ці таннай гарэлкай, а мой вопыт такі, што добрая, беларуская гарэлка ўжо не такая танная, як іншыя беларускія тавары, улічваючы хаця б бензін, які зараз даражэйшы чым у нас. Так што лепш ведаць чаго шукаць, бо рэчаіснасць можа нас схапіць знянацку.

Кожны чагосьці шукае ў жыцці, або прынамсі ў некаторых момантах жыцця. Самае важнае, каб шукаць і жадаць таго, што вартаснае і якаснае для нашай чалавечнасці, бо сёння быць проста чалавекам і жыць згодна са сваім сумленнем — вельмі складаная справа. Можа гэта загучыць надта ўзвышана, але паказчыкам чалавечнасці ў Беларусі для мяне з'яўляецца пашана да беларускасці. Таму, шпацыруючы па Мінску, заўсёды з нецярплівасцю шукаю надпісаў на беларускай мове, часам нават у душы надта хутка цешуся, бо словы бываюць вельмі падобныя, а і варыянты кірыліцы вельмі сабе блізкія. Чаму тады беларускасць так блізкая расейскасці, а заадно так далёкая? На гэта ў мяне адзін адказ і іншы мне ў галаву не прыходзіць. Гэта ментальнасць. Як спяваў згаданы Вольскі: „Мая ментальнасць — сентыментальнасць"... Сентыменталізм — не так дрэнная рыса, але сентыменталізм да савецкасці — рыса ўжо небяспечная. І гэта праблема беларусаў у Мінску. Жывуць, глытаючы ўсе з'явы канзумерызму свету, хаваючы ўсярэдзіне сваю савецкасць. Тую, якую хавалі ў сябе іх бацькі, і тую, якой даглядае паўсюль прысутная дзяржава. А дзяржава любіць прафесію касметолага, якая ў адпаведны момант пудрыць нос, малюе вочы, вусны. Усё для людзей: штораз часцей у кашальках больш грошай, шырэйшы доступ да сусветнага тэлебачання, павышаецца колькасць міжнародных крамаў, ёсць галоўная дзяржаўная ёлка, а Дзедаў Марозаў нават больш, чым у іншых краінах, бо апрача аднаго галоўнага, якога можам сустрэць у Белавежскай пушчы, ёсць і галоўныя абласныя Дзедкі Марозы, якія множаць дзіцячае шчасце.

Калі мы на каталіцкія Каляды ўехалі на мінскі Праспект незалежнасці, то я амаль не захварела ад ністагму, бо вочы разбегаліся паміж тысячамі каляровых ілюмінацый: свяціліся надпісы, зіхацелі зоркі, чырвона-зялёныя сцяжкі — усяго так шмат, што і сам праспект утапіўся ў хвалі захаплення Мінска самім сабою. Часам празмернасць нясе з сабой брыдоту, таму, калі адзін з сябраў пажартаваў, што гэта беларускае Лас-Вегас, такое Лас-Мінск, то мне стала няёмка, бо жарт, як вядома, не заўсёды мусіць быць смешным. Аказалася гэта дадаткова сумным жартам, калі на другі дзень хацела я сфатаграфаваць гэтае „цуда", але апрача ёлкі ўжо нічога не свяцілася. Ва ўмовах крызісу і Беларусь прымушана эканоміць энергію, асабліва калі на атамную электрастанцыю прыйдзецца яшчэ пачакаць.

У галаву прыйшла мне іншая выснова: мо лепш Менску шукаць па-за Мінскам. Асабліва такая думка ахапіла мяне, калі мы пераязджалі над Зэльвенскім вадасховішчам. Пачула я там незвычайны спакой, такі, які нясе з сабой правінцыя, але абсалютна не ў адмоўным сэнсе. Беларуская правінцыя — гэта месца, дзе сустрэнем больш шчырасці чым у вялікім горадзе і не перашкодзяць таму нават тыя аднолькавыя агароджы і кепска адмаляваныя будынкі, якія віталі прэзідэнта ў час адной з ягоных паездак. Асабліва зімой цяжка там нешта ўдаваць. Белая прастора аснежанай гладкай паверхні лёду ці палёў адкрывае ўсё. Твары людзей ніяк не схаваюць, што рыбалка для таго, каб на свята смачней паесці, каб стол быў прыгажэйшы, багацейшы, а і падзарабіць можна было пры нагодзе. Пры плаціне лавіў чалавек, у якога хацелі купіць шчупака, але хутка нас асвядоміў, што першую рыбу нельга прадаваць. Паказаў затое твар у аб'ектыве фотаапарата, падказаў, дзе ў Зэльве вуліца Пабеды і загаварыў нават у пару словах па-беларуску, што мяне асабліва захапіла. Кожны раз здзіўляюся сама сабе, адкуль такая радасць ад кожнага пачутага беларускага слова, прытым у самой Беларусі, у месцы, дзе на свеце павінна быць найбольш беларускамоўных людзей, а якія, на жаль, ўсё ж такі яшчэ не ў змозе паверыць, што сваё — самае якаснае.

Астравецкі разлом ☞ 2

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Акурат перад новым годам дзяржаўная ўлада Рэспублікі Беларусь усё ж зрабіла свайму ўдзячнаму народу чаканы, але ад гэтага не менш непрыемны „падарунак". Гутарка ідзе, канешне, пра выбар пляцоўкі для пабудовы атамнай электрастанцыі. Любіць гэтая ўлада ўсё ж круглыя даты, нейкае асаблівае ў яе стаўленне да магіі лічбаў...

Перадсвяточнае фарысейства... ☞ 2

Марк ЦЫБАРТ

Я, як легкаверны і наіўны чалавек, быў шакіраваны, калі некалькі гадоў таму пабачыў у тэлевізары быццам паглыбленую ў малітву твар вядомага дзеяча камуністычнай партыі, які кленчыў перад іконай Божай Маці на Яснай Гуры. Але я, як той, хто імкнецца думаць рацыянальна, ані на момант не расчуліўся навярненнем дзеяча, бо на вярсту адчуваўся фальш ад малітвы перад тэлекамерамі...

Рыба на Куцую ☞ 4

Міхал МІНЦЭВІЧ

Шматкультурнасць ☞ 5

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Самі гналі, каб пражыць ☞ 12

Міра ЛУКША

Фота Ілоны КАРПЮК

9 770546 196000

Астравецкі разлом

Акурат перад новым годам дзяржаўная ўлада Рэспублікі Беларусь усё ж зрабіла свайму ўдзячнаму народу чаканы, але ад гэтага не менш непрыемны „падарунак". Гутарка ідзе, канешне, пра выбар пляцоўкі для пабудовы атамнай электрастанцыі. Любіць гэтая ўлада ўсё ж круглыя даты, нейкае асаблівае ў яе стаўленне да магіі лічбаў. Бо роўна сто год таму — 28 снежня 1908 года адбыўся найбольш моцны землятрус на тэрыторыі Беларусі — каля Гудагаю (сёння вядомая чыгуначная станцыя) па шкале Рыхтара было зафіксавана 6-7 балаў. З таго часу і ўтварыўся так званы астравецкі разлом. Навукоўцамі даказана (ніхто нават не спрабуе аспрэчыць), што менавіта гэта месца на тэрыторыі Астравецкага раёна ёсць найбольш небяспечным у Беларусі ў сейсмалагічным сэнсе. Але ж аўтары мегапраекта выбралі для будаўнічай пляцоўкі менавіта яго. Нягледзячы і на неспрыяльную ружу вятроў. Значыць нейкі сэнс у гэта закладзены?

Днямі ўдалося патрапіць на пасяджэнне гарадзенскага прэс-клуба, дзе якраз і абмяркоўвалася пытанне пабудовы АЭС. Сабраліся пераважна мясцовыя журналісты, прыйшоў і адзін з гарадзенскіх навукоўцаў, які яшчэ пару год таму актыўна выступаў за пабудову такой станцыі, маўляў, яна можа стаць чыннікам энергетычнай бяспекі краіны. Шаноўны біёлаг даводзіў слушнасць будовы АЭС, спасылаўся на досвед Японіі, на фінскія тэхналогіі, але гучалі яго аргументы зусім непераканаўча. Хоць бы таму, што ні японскія будаўнікі, ні фінскія тэхналогіі не мелі і не будуць мець у бліжэйшыя гады да Беларусі аніякага дачынення. Бо будаваць станцыю будзе Расія, пра гэта пасля цэлага года ідэалагічнага камуфлявання нарэшце заяўлена простым тэкстам. А значыць наша залежнасць ад імперскага Крамля стане калі не абсалютнай, то надзвычай моцнай. Да ўсяго, перафразуючы адно выслоўе, можна сказаць — што б не будавалі расіяне, рана ці позна яно разваліцца альбо бабахне.

Наступны контраргумент таксама ніхто нават не збіраецца аспрэчваць — для Астравеччыны, гэтай беларускай Швейцарыі, як назваў яе Адам Мальдзіс, будаванне станцыі стане сапраўднай экалагічнай катастрофай. Нават пры ўмове нармальнага функцыянавання АЭС, значная частка ўнікальнага прыроднага ландшафту зменіцца карэнным чынам, а надзвычай чыстыя рэкі, у якіх зараз вядзецца нават праходны ласось, будуць забруджаны. Бо на сёння не існуе абсалютна чыстых тэхналогій, а для ахаладжэння рэактараў патрэбныя вялікія аб'ёмы вады. А чыстая вада ў дваццаць першым стагоддзі па ацэнках многіх навукоўцаў стане адным з асноўных прыродных багаццяў. Так што і эканамічны эфект сучасных АЭС досыць сумніўны. Тым больш, што можна будзе забыцца пра развіццё турызму ў гэтым рэгіёне, найбольш прыдатным для адпачынку.

Характэрна, што ніхто не ведае сапраўднага аўтара гэтага праекта, а пытанне будаўніцтва канчаткова так і не вырашана да сёння. Чаму? Адказ вельмі просты — ніхто з чыноўнікаў і начальнікаў не хоча браць на сябе персанальную адказнасць. Відаць усё ж задумваюцца пра гістарычнасць гэтага страшнага выбару. Так што канчатковае зацвярджэнне будзе зроблена галоўнай асобай дзяржавы. А тым часам мясцовая ўлада разгарнула шырокамаштабную прапагандысцкую кампанію (чаго вартыя адны загалоўкі ў газетах кшталту „Будем дружить станциями") па ўплыве на свядомасць найперш жыхароў тэрыторый, якіх хочуць „ашчаслівіць". Галоўная ідэалагічная прынада — гэта абяцанне вялікай колькасці новых працоўных месцаў. І што вы думаеце, многія ўжо не баяцца аніякай радыяцыі — абы была праца. Бедныя мясцовыя людзі, якую працу ім могуць даць на гэтай будоўлі ці ўжо гатовай станцыі?! Хіба катлаваны капаць рыдлёўкамі, а потым імі ж закопваць адкіды. Так што найбольш страшны „астравецкі разлом" адбываецца ў свядомасці. Парушаюцца і ўсе прынцыпы так званай Орхускай канвенцыі, якую падпісала Беларусь і паводле якой такія праекты вымагаюць шырокага грамадскага абмеркавання.

Будаванне АЭС на тэрыторыі Беларусі — гэта зусім не рэгіянальная праблема, гэта агульнанацыянальная бяда. Гэта галоўны выклік сённяшняга дня, сапраўдны тэст для насельнікаў краіны: палітычных дзеячаў, якія ў бальшыні сваёй у гэтым пытанні пакуль „жуюць смаркачы", — на спеласць, журналістаў — на сумленнасць, грамадзян — на элементарны жыццёвы розум.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Перадсвяточнае фарысейства або Дабрачынныя „вігіліі" і чыноўніцкія „аплаткі"

Я, як легкаверны і наіўны чалавек, быў шакіраваны, калі некалькі гадоў таму пабачыў у тэлевізары быццам паглыбленую ў малітву твар вядомага дзеяча камуністычнай партыі, які кленчыў перад іконай Божай Маці на Яснай Гуры. Але я, як той, хто імкнецца думаць рацыянальна, ані на момант не расчуліўся навярненнем дзеяча, бо на вярсту адчуваўся фальш ад малітвы перад тэлекамерамі. „Ты ж, калі молішся, зайдзі ў пакой твой і, зачыніўшы дзверы твае, памаліся Айцу твайму, Які ў тайнасці; і Айцец твой, Які бачыць у тайнасці, аддасць табе на яве" (Мф. 6, 6). Як штогод святочны перыяд прынёс нам асаблівае ўзмацненне ўсялякіх варыянтаў публічнага малітоўнага фарысейства.

Рыдальным ад хвалявання голасам дыктары па радыё і тэлебачанні давалі нам справаздачы з „аплаткаў" для адзінокіх і ўбогіх. Пасля смерці жонкі я таксама стаў адзінокім і ведаю, як адчувае сябе чалавек у час вігіліі-куцці ці ў вялікія хрысціянскія святы ў самоце. Выць бы ад роспачы, але трэба паказваць радасны твар, бо так увогуле нікога мая самота не цікавіць. Папраўдзе ў многіх дамах ставяць на стол дадатковую талерку для адзінокіх і здарожаных, аднак трэба быць настолькі прыстойным, каб ёю не пакарыстацца. А публічныя вігіліі для адзінокіх гэта для мяне чарговы доказ псеўдахрысціянскай крывадушнасці. Бо што гэта за куцця на тры дні раней да сапраўднай? Што яна можа даць чалавеку апрача дармовых харчоў? Але яна дасканала супакойвае сумленні работнікаў усялякіх „цэнтраў міласэрнасці", якія ў належным тэрміне і радасна правядуць час у сямейным коле. І неяк нікому са штатных дабрачынцаў не прыйшло ў галаву, што сустрэча з убогімі і адзінокімі мае сэнс толькі ў належны час і што можа яна быць цудоўнай нагодай навучыць дзяцей ці сваякоў такога „дзеяча" адпаведнага стаўлення да бліжніх. Якое ж вялікае выхаваўчае значэнне меў бы ўдзел у такой вячэры дзяцей і больш прыемна ды аўтэнтычна выглядала б гэтае спатканне ў вачах запрошаных абяздоленых. Усё людское — недасканалае, тады можа арганізатары ўсялякіх перадсвяточных сустрэч падумаюць што і як змяніць у сваіх дзеяннях, каб было лепш і... больш сумленна.

Другая справа, датычная перадсвяточнага фарысейства, гэта ўсялякага роду „аплаткавыя спатканні". Цяпер ладзяць іх усе і ўсюды: ваяводы і дэпутаты, бурмістры і войты, дырэктары і каменданты, загадчыкі і іншыя камедыянты. Цяпер амаль кожная прафесія мае свайго капелана, а амаль кожная ўстанова — сваю капліцу. І ўсе гэтыя асяроддзі „навернутых" не будуць адчуваць дома святочнага настрою, калі раней не паўдзельнічаюць у службовай аплатцы, найлепш з удзелам біскупа. Усе пераломваюцца аплаткай, віншуюць сябе, калядуюць, добры шэф-бацька падыходзіць да кожнага працаўніка, добры душпастыр-біскуп падыходзіць да ўсіх кіраўнікоў... Поўна радасці і любові, ёлка ў куце, агапа пры стале, прысутныя адчуваюць сябе быццам у небе. Такая вось у нас хрысціянская краіна, што без крапіла і кроку зрабіць нельга. Шкада толькі, што хрысціянскую любоў рэдка спазнаюць наведвальнікі ўстаноў, але гэтаму нельга спецыяльна здзіўляцца: сумленны чалавек сваімі справамі не дурыў бы галавы зусім чужым людзям, у якіх і так многа розных заняткаў.

Наша двухканфесійнае ваяводства мае двайное шчасце да такога тыпу мерапрыемстваў: калі канчаюць адны, пачынаюць другія. А пазней яшчэ пасляпасвяточына сустрэчы актыву ў глыбінцы з варшаўскім іерархам: нішто так не ўмацоўвае веры ў народзе, як царкоўны ордэн, завешаны на шыі адпаведнага войта ці дырэктара, незалежна ад яго стаўлення да рэлігіі. Ну бо калі б было інакш, то ці ж столькі парарэлігійных мерапрыемстваў адбывалася б ва ўстановах?

І толькі — як заўсёды — не ўсе задаволеныя такім росквітам рэлігійнага жыцця. Перачытваю акурат кнігу аб такім Незадаволеным. Ведаеце, што ён сказаў? „І калі молішся, не будзь, як крывадушнікі, што любяць у сінагогах і на рагах вуліц, стоячы, маліцца, каб выставіцца перад людзьмі. Праўду кажу вам, што яны атрымліваюць узнагароду сваю" (Мф. 6, 5). Ну, але гэта старыя словы, а іх Аўтар нават протаіерэем не быў, так што сёння можа яны ўжо неактуальныя?..

Марк ЦЫБАРТ

Вачыма еўрапейца

Зноў палічымся

Яшчэ да Новага года трапілі мне ў рукі ўрадавы праект закону аб чарговым нацыянальным перапісе, які мае быць праведзены ў 2011 годзе ды адпаведныя праекты распараджэнняў Савета міністраў, якія з'яўляюцца спадарожнічаючымі яму асноўнымі выканаўчымі актамі. Пры гэтай нагодзе прыгадалася мне бура, якая прайшла пасля апублікавання вынікаў папярэдняга перапісу, дзе амаль кожная арганізацыя нацыянальнай ці этнічнай меншасцей ставіла пад пытанне ягоную верагоднасць, заяўляючы, што пададзеныя лікі абніжаныя ў параўнанні з лікамі сапраўды пражываючых у Польшчы прадстаўнікоў меншасцей. З'явілася праблема — агульна кажучы — ці рэспандэнты апасаліся прызнацца да свае нацыянальнасці, ці мо не хочуць з ёю атаясамлівацца, а можа пытанні былі пастаўлены, а і сам перапіс праведзены быў неадпаведна. У той час, значыць, паміж 21 мая і 8 чэрвеня 2002 г. аказалася, што ў Падляшскім ваяводстве пражывае ледзь 48 тысяч 723 беларусаў (95 % усіх беларусаў пражываючых у Польшчы). Раней гаварылася аб значна большых ліках. Што цікавае, аказалася, што на Падляшшы знаходзіцца блізка васьмітысячная група, якая не ў змозе акрэсліць сваю нацыянальную прыналежнасць. Вядомы сацыяёлаг з Універсітэта ў Беластоку гаварыў у адным з інтэрв'ю, падагульваючы вынікі нацыянальнага перапісу 2002 года:

— У прынцыпе, перапіс падарваў паўсюднае ўяўленне на тэму ліку беларусаў у Польшчы. Тыя ўяўленні былі ўфармаваныя рознымі асобамі, якія распаўсюджвалі перакананне, што ўсе праваслаўныя гэта беларусы. Раней гаварылася, што ў Польшчы іх амаль 850 тысяч, пасля чаргова гэты лік памяншалі да 300-400 тысяч вернікаў праваслаўнага веравызнання.

Далей прафесар дадаў:

— Адначасова, асноўваючыся на маіх шматразовых даследаваннях на прадстаўнічых пробах з агульнага ліку жыхароў Беластоцкага ваяводства (Падляшскага) можна досыць верагодна сцвердзіць, што ацэнчна адна трэць праваслаўнага насельніцтва адачувае сябе беларусамі.

Пасля заявіў:

— Найважнейшая памылка перапісу заключалася ў тым, што ў пытанні аб тым, да якой нацыянальнасці я прылічаюся, былі прадбачаны адказы толькі ў двухпадзельнай постаці: польскай або няпольскай. На пагранічча ўтрымліваецца таксама тоеснасць у рознай ступені шматкультурная. Шмат людзей у рознай меры мае пачуццё падвойнай нацыянальнай прыналежнасці. У выпадку польска-беларускага пагранічча можна выявіць такія тыпы тоеснасці: тутэйшы паляк, паляк беларускага паходжання, паляк і беларус, польскі беларус. Ніякіх тоеснасцевых нюансаў такога тыпу праведзены перапіс не вылавіў, а — наадварот — прымусіў рэспандэнтаў да выбару часта цяжкай пазіцыі ў выглядзе выбару: або я паляк, або я — беларус.

І вось я пераглянуў закон аб новым агульнанацыянальным перапісе, прымаючы пад увагу такія засцярогі прафесара Садоўскага. Не вынікае з іх, што ўдасца ўрэшце выказаць прыгаданыя прафесарам нюансы. Па-мойму, для большай верагоднасці перапісу наконт нацыянальных пытанняў, хапіла б паставіць пытанні на падставе пералічаных умоў акрэсліваючых прыналежнасць да меншасці ў законе аб іх ад студзеня 2005 года. Адно несумненнае, дык факт, што дзяржава пасля перапісу 2011 года будзе мець больш дэталёвыя дадзеныя аб кожным грамадзяніне, уключна з актуальнымі нумарамі стацыянарных і мабільных тэлефонаў ды электроннымі адрасамі кожнага, а адной з навінак будуць пытанні аб унутраных і замежных міграцыях.

Мацей ХАДАДОЎСКІ

Ізноў страх у Гайнаўцы

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Калі ў час Першай сусветнай вайны ў невялікім прыпушчанскім пасёлку стала будавацца фабрыка па пераапрацоўцы драўніны, яшчэ нішто не прадказвала, што ў гэтым месцы ўзнікне горад, які ў будучыні вартасцю прададзенай вытворчасці апярэдзіць старажытны Бельск-Падляшскі. Вытворчасць у Гайнаўцы стала абапірацца ў галоўным на вырабы з драўніны і на велізарнае **Гайнаўскае прадпрыемства дрэваапрацоўчай прамысловасці**, у якім у 1970-х гадах працавала больш за 1700 чалавек, у тым ліку многія рабочыя з навакольных вёсак — Койлаў, Курашава, Чыжоў, Арэшкава...

Гайнавяне спадзяюцца, што іх славутае дрэваапрацоўчае прадпрыемства, якое зараз у галоўным засяродзілася на прадукцыі мэблі, змагаецца толькі з часовымі цяжкасцямі і з паяўленнем большага запатрабавання ў замежных краінах і Польшчы на прадукты хатняга ўжытку, а ў гэтым ліку і на мэблю, пабольшае прадукцыя ў гайнаўскім „Фортэ" і кіраўніцтва ізноў пачне прымаць на работу працаўнікоў

Гайнаўка славілася вырабамі з драўніны

Пры народнай уладзе з прыпушчанскага горада выязджалі ў свет розныя паўфабрыкаты з драўніны і мэбля, якія лічыліся вельмі якаснымі прадуктамі. „Гайнаўскі тартак" — бо так называлі прадпрыемства жыхары горада і наваколля, мае сваю багатую гісторыю, апісаную доктарам Уладзімірам Паскробкам, якога прафесійнае жыццё знітаванае з гайнаўскім дрэваапрацоўчым прадпрыемствам.

— Гаворыцца, што ў 1970-х гадах у Гайнаўскім прадпрыемстве дрэваапрацоўчай прамысловасці працавала дзве тысячы людзей, але гэта перабольшванне. Сапраўды ў гэты час наша прадпрыемства разбудоўвалася і трэба было прыняць на працу каля 400 новых работнікаў. З адміністрацыйнымі працаўнікамі ездзілі мы па вёсках і ўгаворвалі маладых людзей паступаць да нас на працу. Дзякуючы нашаму прадпрыемству Гайнаўка тады па колькасці прададзенай вытворчасці была на другім месцы ў Беластоцкім ваяводстве і апярэджвала не толькі Бельск-Падляшскі, але і Ломжу ды Сувалкі. Працавала ў нас каля 1750 чалавек, — кажа доктар Уладзімір Паскробка, сённяшні ўжо пенсіянер.

Калі пасля 1989 года ў Польшчы з'явілася магчымасць прыватызаваць дзяржаўныя прадпрыемствы, хутка гайнаўскім „тартаком" з вялікімі прадукцыйнымі і арганізацыйнымі магчымасцямі зацікавілася **суполка з англійскім капіталам „Фурнель"**. Стаўшы ўласнікам гайнаўскага дрэваапрацоўчага прадпрыемства выдатна падняла яна плату для ўсіх работнікаў, якія сталі зарабляць у „Фурнелі" ў два або і тры разы больш, чым іх сябры на дзяржаўных або кааператыўных прадпрыемствах. Выклікала гэта захапленне капіталізмам і яго магчымасцямі для сумленна працуючых людзей.

Цяжкі час для дрэваапрацоўчай прамысловасці

Аднак пасля ўзлёту настрояў прыйшлі шэрыя будні. Спачатку пачаліся натуральныя абмежаванні колькасці работнікаў у „Фурнелі", бо людзі адыходзілі на пенсіі, а на працу прымалі мала маладых асоб. Пасля распачаліся скарачэнні штатаў як сярод фізічных, так і адміністрацыйных працаўнікоў. Доўга яшчэ гаварылася, што ў „Фурнелі" працуе пад тысячу работнікаў, але пасля прыйшла дрэнная экспартная кан'юнктура. Сталі ў Гайнаўцы абанкручвацца некаторыя меншыя дрэваапрацоўчыя прадпрыемствы, а ў „Фурнелі" рэзка панізіліся зарплаты. Рабочыя вызваляліся або адыходзілі на ранейшыя пенсіі, а прадукцыя ўсё меншала і меншала. У Гайнаўцы сталі нават гаварыць, што адны з самых нізкіх зарплат у горадзе маюць якраз работнікі „Фурнеля", задоўжанасць якога стала большаць і большаць. Менавіта па гэтай прычыне некаторыя зямельныя ўчасткі, якія займала дрэваапрацоўчае прадпрыемства, з-за задоўжанасці перайшлі ва ўладанне гарадскіх улад, а пасля іх продажу на былых фабрычных пляцах былі збудаваны тры вялікія магазіны. Частку будынкаў былога „Фурнеля" займаюць зараз прыватныя суполкі.

Ужо ў XXI стагоддзі паі ў суполцы „Фурнель" стала пераймаць вядомая на польскім рынку мэблевая **група „Фортэ"**, якая канчаткова поўнасцю пераняла гайнаўскі „Фурнель". Спачатку былі чарговыя звальненні работнікаў, але пасля, калі гайнаўскае аддзяленне „Фортэ" сышло з разнароднай прадукцыі і засяродзілася на вытворчасці дарагой мэблі з суцэльнай драўніны, суполка заінвеставала ў Гайнаўцы больш за 30 мільёнаў злотых. Група „Фортэ" яшчэ ў 2005 годзе збудавала ў Гайнаўцы велізарны цэх плошчай у 18 тысяч квадратных метраў, у якім былі пастаўлены сучасныя прадукцыйныя лініі. Тады было яшчэ вялікае запатрабаванне на дарагую мэблю з суцэльнай драўніны, з фанернай абліцоўкай і з багатай абіўкай. Таму гайнаўскай фабрыцы ўдалося сплаціць ранейшыя даўгі і атрымаць прыбытак. Стала яна прымаць на працу маладых работнікаў. Усё прадвяшчала, што гайнаўскае мэблевае прадпрыемства, у вялікай ступені працуючае на экспарт, будзе разгортваць сваю дзейнасць і ствараць новыя месцы працы. Жыхары заходніх краін часта ж рамантуюць свае дамы, прадаюць або мяняюць старую мэблю, а на яе месца купляюць новую. Праекціроўшчыкі мэблі стараліся задаволіць густы кліентаў з Германіі, Бельгіі ці Галандыі. Аднак у 2007 годзе пачаўся сусветны крызіс у галіне продажу мэблі. Паколькі дарагая мэбля з Гайнаўкі ішла на Захад, хутка адчула яго гайнаўская фабрыка. Паводле кіраўніцтва „Фортэ", у 2007 годзе фабрыка прынесла сваім уласнікам ажно 14 мільёнаў злотых страт, а ў першым паўгоддзі 2008 года — чарговыя 4 мільёны зл.

Кожнае звальненне работніка — сямейнае няшчасце

Інфармацыю пра планаванае звальненне з „Фортэ" 184 чалавек многія жыхары горада спачатку ўспрынялі з недаверам. Асабліва кранула гэта сэрцы людзей, якія шмат гадоў перапрацавалі ў дрэваапрацоўчай прамысловасці.

— Зараз сапраўды фінансавае становішча нашай фабрыкі вельмі цяжкое, бо на Захадзе з-за крызісу абмежаваўся попыт на якасную і дарагую мэблю, а туды ж пастаўлялася вялікая частка нашай прадукцыі. У Польшчы складаней прадаць мэблю з суцэльнай драўніны, чым танную мэблю з іншых фабрык групы „Фортэ", — тлумачыць былы працаўнік дрэваапрацоўчага прадпрыемства, доктар Уладзімір Паскробка. — Даведаўся я, што пасля прадбачваных звальненняў прадугледжваецца прадукцыя толькі на адну змену (зараз праца вядзецца на дзве змены).

Управа групы „Фортэ" з г. Остроўў-Мазавецка яшчэ ў канцы лістапада паведаміла Павятовую ўстанову працы ў Гайнаўцы аб прадбачваных групавых звальненнях сваіх работнікаў, якія практычна распачаліся ўжо са снежня. Ужо некаторым работнікам скончыліся дамовы на працу і не атрымалі яе пралангацыі, іншых — чакаюць скарачэнні. Рашэнне аб звальненні 184 работнікаў гайнаўскай мэблевай фабрыкі прыняла ўправа групы „Фортэ" з г. Остроўў-Мазавецка, у склад якой уваходзіць гайнаўскі завод. Яшчэ ў лістападзе на гайнаўскай фабрыцы працавала каля 460 асоб і спачатку прадбачвалася звольніць з работы больш за 220 чалавек, але пасля кансультацый управы групы „Фортэ" з мясцовымі прафсаюзамі ўдалося абмежаваць размер звальненняў.

— Сусветны крызіс мае ўздзеянне і на нас. Ад многіх месяцаў наша прадпрыемства прыносіць суполцы страты. Склады загружаны прадукцыяй, якую цяжка прадаць. Вядома, што мэблевыя фабрыкі ў Беластоку і Сувалках не будуць працаваць, каб пагашаць нашу нерэнтабельнасць, — заявіў Анатоль Скепка з галіновых прафсаюзаў, якія разам з іншымі прафсаюзамі згадзіліся на звальненне 184 асоб, пры ўмовах, што не будуць звальняцца ўдовы і па дзве асобы з адной сям'і. Вядома таксама, што работнікі, якія пасля доўгага абучэння абслугоўваюць складаныя машыны застануцца, бо без іх цяжка было б абслугоўваць прадукцыйныя лініі.

— Усе работнікі са страхам чакаюць вырашэнняў хто будзе звольнены, а хто застанецца працаваць, — жаліўся адзін з работнікаў. Інфармацыя аб звальненнях будзе ў пісьмовай форме перадавацца работнікам да 31 студзеня.

Да групы „Фортэ" належаць таксама фабрыкі мэблі ў Беластоку, Сувалках, Пярэмышлі, на Украіне і ў Расіі. Вялікая частка прадукцыі трапляе на экспарт, у галоўным у Германію, Галандыю, Бельгію, Чэхію, Славакію і на Украіну. Найбольш мэблі на экспарт (па працэнтных падліках) прадукавалася якраз у Гайнаўцы і таму сусветны крызіс на рынку мэблі крануў у першую чаргу якраз гайнаўскае прадпрыемства.

— На вялікае абмежаванне продажу нашай мэблі мелі ўздзеянне курсы замежных валют, некарысныя для куплі драўніны за мяжой і палітыка Дзяржаўных лясоў, якія дорага прадаюць нашу драўніну, — заявіў для Польскага радыё віцэ-прэм'ер і заадно міністр эканомікі Вальдэмар Паўляк, які не бачыць магчымасці дафінансоўваць прадукцыйныя прастоі ў фабрыках мэблі (наш урад разглядае прапанову, каб такія дафінансаванні даць фабрыкам аўтамабіляў, паколькі краіны Еўрасаюза намерваюцца дафінансаваць гэтую галіну прамысловасці). Адначасна суцешвае ён, што пры танным злотым памалу павіна ўзрастаць зацікаўленне купляй нашай мэблі за мяжой. Аднак для разварушэння прадукцыі і продажу большай колькасці мэблі патрэбная танная сыравіна, а ў выпадку нашай краіны — паніжэнне цаны драўніны з Дзяржаўных лясоў, што прадвяшчалася раней.

Кіраўніцтва „Фортэ" тлумачыць, што звальненні работнікаў — гэта спроба выратаваць гайнаўскую фабрыку мэблі ад цалкавітага банкруцтва. Аднак работнікі апасаюцца, што нават звальненні могуць не прынесці выдатнай паправы фінансавага становішча прадпрыемства, каб яно ізноў стала прыбытковым. У такім выпадку магло б дайсці да чарговых звальненняў працаўнікоў. Аднак у гайнавян ёсць надзея, што іх славутае дрэваапрацоўчае прадпрыемства, якое зараз у галоўным засяродзілася на прадукцыі мэблі, змагаецца толькі з часовымі цяжкасцямі і з паяўленнем большага запатрабавання ў замежных краінах і Польшчы на прадукты хатняга ўжытку, а ў гэтым ліку і на мэблю, пабольшае прадукцыя ў гайнаўскім „Фортэ" і кіраўніцтва ізноў пачне прымаць на работу працаўнікоў.

Пры нагодзе мамаграфіі

Час ад часу падляшскія вёскі наведвае спецыяльна аснашчаны аўтобус, у якім нашы жанчыны могуць зрабіць мамаграфію — абследаванне малочнай залозы на наяўнасць рака. Гэта вельмі каштоўная ініцыятыва, паколькі выяўленне ранняй стадыі хваробы дазваляе цалкавітае яе вылячэнне.

Нядаўна такі аўтобус наведаў гміны Гайнаўскага павета. Зацікаўленне жанчын было вялікае, аднак былі і такія кабеты, якія адмовіліся ад абследавання. А прычынай гэтаму быў мужчынскі экіпаж аўтобуса — двух маладых мужчын і адзін трохі старэйшы. Само абследаванне грудзей бянтэжыць многіх жанчын, а ўжо поўнасцю непрымальным з'яўляецца яно ў выкананні мужчынскай абслугі. Чаму арганізатар гэтай карыснай акцыі не падумаў аб так простай і асноўнай справе як права людзей на сорам? Ці ж нельга было выслаць у глыбінку хаця б адну жанчыну? Аднак, відаць, што самыя простыя справы бываюць у нас складанымі...

М. Ц.

Наш скарб

Некалькі разоў перачытваў я артыкул Міры Лукшы „Пяюць малечы з меншасцей" („Ніва" № 44 ад 2 лістапада 2008 г.). І за кожным разам радуецца сэрца, асабліва калі гляджу на дзетак з садка № 14 у Беластоку, якія спяваюць у калектыве „Вясёлка". Прыгожыя дзяўчынкі ў народных строях 10 кастрычніка паспяхова выступілі на фестывалі дзіцячай песні нацыянальных меншасцей з беларускімі вершамі і песнямі. Яны — наш скарб, наша будучыня.

Высокай ацэнкі заслугоўваюць не толькі настаўнікі садкоў з Беластока, але і з Гайнаўкі, Бельска ці Пуньска, якія навучылі дзетак сваіх родных песень. Але трывожыць мяне паўсюдная абыякавасць да роднага ў іншых асяродках. Чаму на фестывалі дзіцячай песні нацыянальных меншасцей не выступілі дашкольнікі з Гарадка, Міхалова, Сямятыч?.. Чаму ніхто над гэтым не працуе? Прыкра, што арганізацыі ў нашым асяроддзі, у тым ліку і БГКТ, не заўважаюць, што дзеткі і моладзь — гэта залаты скарб нашай будучыні. Гэта ж дзякуючы ім будзе працягвацца дадзеная нам продкамі наша багатая традыцыя.

Віктар БУРА

Не хвалі

Не хвалі пагоду з рання,
А кабет із моладу,
Бо давесці могуць свет
Да вайны, да голаду.
Рана сонейка прыгрэе,
Міла паглядаці,
А як потым вецер дзьмухне —
І ўжо па хаце.
А той жонцы маладой
Цяжка рана ўстаці:
Яна ж усю ноч гуляла,
Хочацца паспаці!
Вось за гэта ў сямейцы
Няма ладу, згоды:
Маці сына павучае:
„Не дай ёй выгоды!
Бо нявестка маладая
Хай сядзіць у хаце.
Трэба мужа даглядаць,
Дзетак гадаваці!"

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Фота Ілоны КАРПЮК

Рыба на Куццю

Міхал МІНЦЭВІЧ

У ліку дванаццаці страў, якія рыхтуюцца на Куццю, не можа бракаваць рыбы — першабытнага хрысціянскага сімвалу тайны (ад грэчаскага слова 'ichthys' — рыба, якога асобныя літары абазначаюць: Ісус Хрыстос, сын Бога). Рыба нагадвае нам пра патрэбу зычлівага стаўлення да чалавечых тайнаў. Дробныя штодзённыя справы, якія давярае нам другі чалавек, важны яму і не могуць стаць падставай для плётак і абвінавачанняў. І захоўванне тайнаў трэба нам вучыць нашых дзяцей.

Пакуль рыба трапіць на калядны стол, яе нехта мусіць злавіць або купіць ды падрыхтаваць. З купляй рыбы з'яўляюцца дахаты і клопаты — хто тую рыбу мае забіць. Бывае, што куплены карп вандруе не на стол, а ў... стаў. Рыба гэта не толькі сімвал...

Найбольш дачынення з рыбай маюць несумненна рыбаловы. У Орлі адным з ветэранаў гэтага занятку, які лоўляй рыбы займаецца з 15-гадовага ўзросту, з'яўляецца Міхал Тхажэўскі, 63-гадовы пенсіянер, па прафесіі муляр-тынкоўшчык. Гэта не толькі выдатны рыбалоў, але і дасканалы назіральнік за прыродай ды чалавечымі паводзінамі. Завёў я з ім размову:

— Ці людзі заказваюць яшчэ ў Вас свежую рыбу на Куццю? І што рыбалову лепш: ласавацца рыбай ці яе лавіць? І якімі рэкордамі штукамі можаце пахваліцца?

— Заказы былі б, але я ўжо нейкі час іх не прымаю; калі б быў крыху малодшы... Людзі ведаюць, што свежая, салодкая рыба мае іншы смак чым купленая ў краме.

На наш калядны стол трапяць шчупакі з Семяноўскага вадаёма; летась бываў я там менш, бо дома было шмат заняткаў і калі стамляўся, то ехаў на „Цагельню" — наш вадаём у Антанове каля Орлі. У мінулым лавіў я нават 12-кілаграмовых шчупакоў, 7-кілаграмовых карпаў, 3-кілаграмовых лінёў. Дома трымаю трафеі — засушаныя іх галовы.

Што лепш? Безумоўна лавіць. Люблю прыроду і сядзеў бы над вадой без аглядкі ці рыба бярэ ці не. Лавіць трэба ўмець. Часта так бывала, што кругом было многа вудзільшчыкаў, а ўлоў быў толькі ў мяне.

— Гавораць, што вялікая рыба менш смачная. Ці на Куццю рыбу рыхтуецца так як і штодзень?

— Калі гаспадыня добрая, то ўмее так падрыхтаваць рыбу, што кожная рыба, нават і вялікая, будзе смачнай. А калі не ўмее, то нават калі тую рыбу выняць з халадзільніка, будзе яе чуць. Таму найлепш рыхтаваць рыбу адразу, свежую.

Люблю смажаную рыбу і са смятанай; таксама марынаваную ў марынадзе. Сам не смажу, хаця ўмею зрабіць гэта выдатна, мо нават лепш чым жонка, але не маю ахвоты. Рыхтаванне рыбы на Куццю больш працаёмкае — кожны хоча падрыхтаваць рыбу неяк інакш.

— Ці рыбалоў паглыбляецца ў глыбейшае асэнсаванне рыбы?

— Гэта неадольная звычка. Добры рыбалоў мусіць думаць аб рыбе. Ёсць ахоўныя перыяды, напрыклад шчупака нельга лавіць са снежня да мая, гэтак жа і сома. Плотка не мае ахоўнага перыяду, толькі неабходную даўжыню.

Развод малявак у вадаёмах таксама з'яўляецца элементам ахоўных мер. Згуртаванне рыбаловаў мае гадавальнікі малька — ліня, карпа, карася, шчупака, акуня — у сваіх ставах на Семяноўцы. У Арлянцы некаторыя віды рыб абнаўляюцца, але не ва ўсёй рацэ, бо ніжэй арлянскай ачышчальні сцёкаў вада непрыдатная для жыцця рыб і там іх амаль не відаць.

— Якімі людзьмі з'яўляюцца рыбаловы?

— Некаторыя нават вельмі нахабныя, бывае многа хамства — хопіць да такога падысці і адразу відаць яго адносіны да рыбы.

— Ці рыбаловы шануюць рыбу?

— Мяркую, што зараз яны больш асвядомленыя і частка трымаецца правіл. А некаторыя, у адсутнасць кантролю, прыхоўваюць злоўленых малькоў. Пашаны рыбам усё яшчэ трэба навучаць. Цяпер вудзіць можна навучыцца самапасам, бо ёсць часопісы. А калісь, пры „камуне", складана было купіць нават кручкі, трэба было старацца з-пад прылаўка — колькі рыб занёс я прадаўшчыцам! А нямецкую лёску (яна была найлепшая) можна было купіць толькі ў Пэвексе. А цяпер рай — у крамах што хочаш, а нават на базары розныя танныя падробкі.

Калісь я вудзіў звычайнымі бамбукавымі вудзільнямі, яшчэ раней ляшчынавымі ці ядлоўцавымі. А зараз добры вудзільшчык мае не толькі размаітыя і дарагія прылады, але да ўсяго гэтага павінен ён яшчэ мець свой пантон, а найлепш то лодку; лодка беспячнейшая за пантон, бо ў ёй можна стаяць. Добрая лодка каштуе больш за тысячу злотаў, да гэтага можна дакупіць рухавік. Адно клопат, бо лодкі крадуць. Адзін бяльшчанін купіў і пакінуў на адну ноч на ланцугу — укралі. У маёй старой лодцы спярша ўкралі ланцуг, тады прывязаў я яе дротам, але пасля нехта і так яе пашкодзіў.

Падкормліваць рыбу можна ў рэках, але ў ставах забаронена падкормліваць і разводзіць прыплод, бо невядома, хто што падсыпае ці выпускае.

Новыя патрабаванні — каб рыбаловы мералі кожную злоўленую рыбу а пасля рапартавалі пра гэта ў свае колы — былі б працаёмкія, але з другога боку добра было б ведаць, бо кожны навыцягаў бы тае рыбы і нічога не асталося б.

— Якую ваду любіць рыба?

— Чыстую і цёплую. Чым глыбей, тым вада халаднейшая. Халоднай вады пазбягае шчупак, але сом заглядае і туды. У халоднай вадзе рыба дранцвее і падае яе мабільнасць.

Вужы? Можна іх сустрэць на Семяноўцы, вечарам выходзяць пагрэцца на бетонных плітах — такія да метра даўжыні.

— Ці рыба можа ўцячы рыбалову?

— Вядома, яна стараецца. Калі апынецца на кручку, то — як кожны — бароніцца, уцякае пад кусты; і то кожная. А бывае, што нават з сачка выскачыць або ад сачка адбіваецца. Калі рыба вялікая, патрэбная дапамога другога вудзільшчыка; мне аднойчы дапамог чалавек з Бельска.

— Ці ад рыбы можна чаму-небудзь навучыцца?

— Яна палахлівая, але можна яе так прывучыць, што будзе плаваць побач ног, а іншая то нават у рукі ўплыве.

— А ці рыба можа ўкусіць?

— Шчупак так. Я аднойчы мяшаў пальцам у вядры і схапіў мяне; у яго вельмі моцны заціск. А рана пасля цяжка гоіцца.

Можна таксама пакалечыцца, ухапіўшы рыбу за вострыя жабры. У шчупака зубы і жабры як кручкі і з іх складана вызваліцца.

Вялікі шчупак часта паглынае качак на вадзе. Сябра са Шлёнска расказваў, што ў іх на вадаёме ў Забжы плаваў хлапец і яго шчупак заатакаваў.

— Ці ў сёлетнюю зіму будзе на рацэ лёд, каб лавіць рыбу?

— Хіба так, толькі пазней. Каб бяспечна лавіць, лёд павінен мець каля 30 сантыметраў таўшчыні, але некаторыя рыбаловы ўваходзяць і на дзесяць. Ловяць плотак, а нават карпаў. У нашым арлянскім коле маем два свердзелы для лёду і некаторыя хлопцы выязджаюць. Маюць прыборы, якія прапануюць рыбаловам крамы і оптавыя склады — гэта бізнес.

У мінулым бывалі такія зімы, што лёд замярзаў да метровай таўшчыні. Калі ў ставе мала вады, тады рыба душыцца, апрача ліня і карася, якія хаваюцца на дне, у мул. Трэба тады праводзіць пад лёд паветра, класці з берагу фашыну, чарот.

Шматкультурнасць

Тэкст і фота
Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

У нашай шырокай, не толькі еўраатлантычнай, іканаграфіі прынялося паказваць сакрум у арэоле. У наш час, час тэхнічнага прагрэсу, арэол займеў новыя формы, новыя стэрэаілюмінатарныя вымярэнні, на якія дазволілі тэхнічныя вынаходствы. Вось, для прыкладу, у Гайнаўцы арэол пастаўлены ўсім тамашнім галоўным культавым збудаваннем: ілюмінацыі суправаджаюць галоўную царкву і галоўны касцёл горада ды два культавыя аб'екты ў парку перад галоўным будынкам павятова-гмінна-гарадскіх чыноў. Вось адзін з гэтых згаданых аб'ектаў — зубр, „імператар пушчы" — нагадвае старазапаветнага язычніцкага цяльца, але богабаязная ілюмінацыя не скіраваная там на яго, толькі ў павіслае над ім неба. Другім са згаданых, абдораных начным арэолам, аб'ектаў з'яўляецца колішні танкастой з уваткнутым у яго арыгінальнага кшталту крыжам. Вось гэтаму апошняму феномену хачу я прысвяціць крыху ўвагі.

На танкастоі, як і сама назва падказвае, стаяў калісь танк, танк-герой, танк „Т-34", які выйграў другую сусветную вайну. Аднак пасля грамадскіх перамен у нашай краіне, калі наша міралюбівае грамадства вызвалілася з Варшаўскага пакту і стала яшчэ больш міралюбівым, падаючы заяўку ў Паўночнаатлантычны пакт, танк з павернутым на захад дулам стаў нашаму грамадству нейк нявыгадным і яно рашыла яго выдварыць з пастамента. Прыгодамі стальнога ваеннага героя ў мірны час я тут займаць увагі не стану; магчыма, што ён быў негатыўна злюстраваны за напрамак ваеннай службы і пастановай страшнага люстрацыйнага суда трапіў у танкавае пекла, значыць у металургічную печ. Іншага танка, больш міралюбівага, напрыклад „Шэрмена", паставіць на той танкастой было немагчыма, бо канструкцыя танкастоя такая, што кожны іншы танк таксама трэба было б павярнуць дулам на захад. Пра знос танкастоя таксама не было думкі, бо гэта вельмі небяспечны план: калісь Гебельс пераконваў, што Германія можа існаваць без Еўропы, але Еўропе без Германіі капут; хто ведае, ці па законе аналогіі Гайнаўка без танкастоя не зарасла б грыбамі і ягадамі. І наша гайнаўскае грамадства, а дакладней гаворачы — эліта нашага гайнаўскага грамадства, рашыла захаваць дэмбельны архітэктурны шэдэўр і яшчэ паставіць на яго крыж. Як задумалі, так і зрабілі...

Адно толькі ў нас з крыжам не такая простая справа, бо наша грамадства культурнае-шматкультурнае, а кожная наша культура мае свой уласны крыж. Можа тады спытаць нехта: а які ж крыж паставіць у культурнай-шматкультурнай Гайнаўцы? Адказ хіба напрошваецца сам: у Гайнаўцы трэба каб стаяў шматкультурны крыж. Як задумалі, так і зрабілі — паставілі крыж шматкультурны і асвятлілі яго арэолам.

Як жа тады выглядае той крыж, які сімвалізуе шматкультурнасць? Выглядае ён вельмі прыстойна ды, як на шматкультурнасць выпадае, увасабляе ён сабой шматлікія крыжапаклонныя культуры. Вазьму, для прыкладу, напачатак, дамінантную ў Гайнаўцы праваслаўную культуру. Вось гэты гайнаўскі посттанкаўскі крыж змяшчае ў сабе, як ні глядзець, найважнейшыя знамянальныя элементы праваслаўнага крыжа, праўда, з невялікай, але сэнсоўнай, мадыфікацыяй. Мадыфікацыя заключаецца ў тым, што правая палова дыяганальнай перакладзіны, якая па традыцыі пахілена ўніз, у Гайнаўцы павернута ўверх. Традыцыйная праваслаўная дыяганальная перакладзіна ж сімвалізуе напрамкі, на якія адправіць людзей Страшны суд: праведнікі пойдуць уверх, у Неба, а зацвярдзелыя грэшнікі будуць скінуты ўніз, у бездань. Шматкультурны крыж жа паказвае, што прадстаўнікам усіх чалавецкіх культур адна дарога, так як напісана ў Кнізе Прапаведніка: „Усё ідзе ў адно месца; усё выйшла з тла, і ўсё вяртаецца ў тло" (3,20).

У гэтым месцы мог бы хто са шматкультурных жыхароў Гайнаўкі пакрыўдзіцца, што посттанкаўскі крыж занадта ўніверсальны, што не падкрэслены, а нават адсутнічае культурны ўклад Захаду. Але гэта вачавідная вачавіднасць, што такое сцвярджэнне памылковае. Бо ў вельмі агульным плане гайнаўскі крыж супадае з пратэстанцкім крыжам гугенотаў, які па сутнасці з'яўляецца мальтыйскім крыжам з дададзенай знізу пікіруючай уніз галубкай, сімвалізуючай сашэсце Святога Духа.

Гэта не ўсё — гайнаўскі крыж можна таксама разглядаць як суму двух крыжоў: лацінскага наверсе і адвернутага ўніз верхам грузінскага Вінаграднага крыжа святой Ніны ўнізе. Мяркую, што ў шматкультурнасці гайнаўскага крыжа сумнявацца не выпадае.

Аднак сам крыж гэта яшчэ не ўсё, што асталося ад танкавай спадчыны. Да фундамента танкастоя прычэплены дзве пласціны: на верхняй з іх вычасаны надпіс „OFIAROM WOJEN, PRZEMOCY I REPRESJI", а на ніжняй „ЖЕРТВАМЪ БРАНИ-ПАРУБЫ И ВЕЛИЯ СКОРБИ'91". Апошні тэкст напісаны стылізаванымі прапіснымі літарамі старамакедонскага алфавіта, затое першы выглядае эталонам сучаснай польскай мовы з лацінскім укладам міжмоўна-шматкультурнага абмену ў апошнім слове заміж карэннага польскага слова „ucisku". Мне вельмі падабаецца гэтая пісаная шматкультурнасць, асабліва ж другі тэкст, перад якой я адчуваю сябе мізэрнай пылінкай Космасу, так як адчуваў сябе наш сярэдневяковы мужык перад тайнамі тагачасных летапісаў. Мяркую, што з такой жа пакораю-ціхмянасцю пакланяўся б я тутэйшай шматкультурнасці, калі б на гайнаўскім помніку былі інскрыпцыі на кітайскай, майскай ці асірыйскай мовах, бо як бы на іх не глядзець — яны з'яўляюцца непахісным доказам закаранелай у нашым менталітэце шматкультурнасці.

Мяркую, аднак, што наша, здавалася б бязмежная, шматкультурнасць, мае ўсё-такі свае межы. Бо, — цалкам фантастычна — дапусцім, што на адной з названых пласцін з'явіліся б літары беларускага алфавіта. І дапусцім, што гэта адбывалася б у наш сучасны час, калі заканадаўства на нашай тэрыторыі спагадлівае для такога роду сенсацый. І вось не магу ніяк пазбыцца мяжуючага з упэўненасцю падазрэння, што тое здарэнне выклікала б у некаторых нашых элітарыяў — ці то быў бы першасядацель нейкага тутэйшага самакіравання, ці то звычайны радны, ці то нават яшчэ звычайнейшы абывацель Пшэпшыцапскі — абурэнне і сярдзітасць на такую задуму. Бо як бы ні глядзець на розныя цяперашнія выдумкі, на шматкультурнасці і талерантнасці, аднак жывуць у нашым грамадстве вартавыя, якія пагеройску не дазволяць ганьбаваць тутэйшай традыцыяй, тутэйшым атавізмам, дзеля якіх стагоддзямі, а асабліва ж дзесяцігоддзямі, пралівалі пот нашы родныя з дзеда-прадзеда цівуны.

Падумай, пакуль скажаш...

Зараз грамадскасць прыняла такі спосаб мышлення, што можна малоць лухту і за словы не несці адказнасці. Прыкладаў на гэта хоць адбаўляй. На рабоце адзін аднаго аплёўвае перад шэфам, каб вырабіць сабе „марку". Сусед суседа абвінавачвае, што агароджу на ягоным участку паставіў. Адны сварацца за мяжу, іншыя зноў за лапік зямлі. Калі паслухаеш гэтай неразбярыхі, здаецца, што ў кожнага свая рацыя. Аднак самае заганнае тое, што пры ўсёй калатнечы ўжываем вульгарызмаў і нецэнзурных эпітэтаў, прытым несапраўдных, якія парушаюць чалавечую годнасць.

У народзе кажуць, што рыба псуецца ад галавы. Мабыць, гэта праўда, бо доказаў у сродках масавай інфармацыі процьма. Дастаткова паслухаць прэс-канферэнцыі лідараў палітычных груповак ці паглядзець пасяджэнні парламента. Адзін садом і гамора. Парламентарыі абкідаюцца граззю і не нясуць адказнасці за свае словы. Але гэтаму балагану пэўна будзе канец, бо былога міністра юстыцыі Збігнева Зёбру суд пакараў за непраўдзівыя абвінавачанні кардыёлага Міраслава Г. (на прэс-канферэнцыі з шэфам Цэнтральнага антыкарупцыйнага бюро Мар'юшам Камінскім пасля арышту кардыёхірурга заявіў: „Już nikt nigdy przez tego pana życia pozbawiony nie będzie"). Зёбра мае заплаціць Міраславу Г. трыццаць тысяч злотых і перапрасіць яго ў трох тэлестанцыях: TVP, TVN і POLSAT зараз пасля выпуску інфармацыйнай праграмы. Абвінавачаны, як і яго сябры з Права і справядлівасці скептычна ставяцца да судовага рашэння, бо, па-іхняму, прыгавор надта суровы. Справа ў тым, што кошт перапросін у тэлебачанні складзе... паўмілёна злотых. Сам экс-міністр заявіў, што такой сумай не валодае і, мабыць, вымушаны будзе прадаць кватэру. На заяву адказаў ужо старшыня парламенцкай камісіі „Прыязная дзяржава" Януш Палікот, які выявіў ахвоту купіць кватэру, каб экс-міністр Зёбра мог ганарова сплаціць даўгі. Калегі ж, у імя салідарнасці, задумваюцца над зборам ахвяраванняў для пакрыўджанага. Прыклад судовага рашэння пэўна будзе перасцярогай для іншых абраннікаў народа.

Па-мойму справа і нас, карэспандэнтаў, тычыцца, бо і мы неаднойчы не задумваемся над тым, што пішам. Варта затым прытрымлівацца народнай мудрасці: „Падумай, пакуль скажаш, або... напішаш".

Уладзімір СІДАРУК

Цяжка

Цяжка мне дабрацца ў „Ніву",
Каб пра штосьці расказаць:
„Пэкаэса" нам забралі,
Няма на чым даязджаць!
Не цікавяцца аб гэтым
Ні староста, ані войт,
Як па вёсках пражывае
Беларускі наш народ.
Каб да лекара дабрацца —
Ёсць вялікая бяда:
Бо чатыры кіламетры
Пешшу трэба дралаваць,
Хвораму назад вярнуцца —
Яшчэ большая бяда;
Шукаць легкавушку трэба,
Вадзіцелю грошы даць.
А даехаць каб у гміну —
Няма што ўжо казаць!.. —
Там для войта перашкаджаць,
Праўды для сябе шукаць!..

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Жывыя калядкі

Цягам апошніх гадоў, як грыбы пасля дажджу, з'яўляюцца новыя конкурсы, агляды, фестывалі. Важнае месца сярод культурных прапаноў займаюць калядныя абрады. Школы, дамы культуры, парафіі проста спаборнічаюць у арганізаванні конкурсаў калядак, батлеек, калядных гвяздаў... Усё гэта захапляе і цешыць, асабліва калі пабачым такі конкурс у тэлебачанні або на іншай *візіі*. У жыцці — бывае па-рознаму. Праўда, калядоўшчыкаў у прыродзе хапае. Апошнім часам яны наязджаюць у вёскі і мястэчкі з нашых гарадоў, асабліва з Беларустока. Ходзяць па дзве тры асобы, звычайна ў сямейных кланах. Гэтыя каляднікі новага тыпу падобныя ў нечым да іншапланецян. Яны адспяваюць абы-як калядку, працягнуць руку і чым хутчэй уцякаюць з хаты. Няма нават магчымасці паставіць ім рытуальнае пытанне: *А чые вы будзеце?!* Калядоўшчыкі новага тыпу звычайна не разумеюць мовы гаспадароў. Часта нават не разумеюць таго, што самі спяваюць, бо як інакш патлумачыць процьму памылак у словах і вымаўленні?! Пасля такіх калядоўшчыкаў астаецца нейкі сум. Замест радасці і захаплення на душу налягае гнятлівасць. Ловіш сябе на брыдкай думцы: вось каб зачыніць перад такімі дзверы!

Згодна з традыцыяй, калядоўшчыкаў трэба сустракаць з радасцю і адкрытасцю (інакш можна пашкодзіць сваёй сям'і і хаце). Абрад калядавання — адна з самых прыгожых традыцый свята Каляд. Асабліва, калі калядуюць дзеткі і моладзь. Разам з сабой яны прыносяць у дом радасць, энергію, надзею. Гаворым, вядома, пра тых, што раней сустракаліся на рэпетыцыях, вывучылі словы калядак, падрыхтаваліся спяваць на галасы, вывучылі словы пажаданняў гаспадарам і іх гасцям. Трэба памятаць, што мужчынскай кампаніі не выпадае хадзіць без гвязды. Калядныя зоркі — наш рэгіянальны рэквізіт. У кожнай кампаніі павінна быць свая ўласная гвязда. Найлепш, калі яна дастаецца нам у спадчыне па бацьках або старэйшых братах. Яе абавязкова трэба ўпрыгожыць перад кожнымі святамі, папоўніць тэхнічнымі навінкамі (гэты занятак выключна мужчынскі!). Усе тэхнічныя навінкі павінны дапамагаць і служыць справе. Вось, мае знаёмыя дамаўляюцца на супольнае калядаванне па інтэрнэце. Адначасова яны падбіраюць рэпертуар і абмяркоўваюць сцэнарыі выступленняў у кожнай паасобнай хаце. З гэтага боку найлепш відаць, што ў калядным абрадзе як і ў жыцці: найважнейшыя жывыя сустрэчы, жывое слова, супольнае спяванне. З дапамогай заўсёды прыйдуць нам бацькі або бабулі з дзядулямі. Варта вывучыць калядкі з часоў іх маладосці, найлепш на гаворцы сваёй вёскі. Божае Нараджэнне забавязвае! Не хопіць выступіць адно ў конкурсе ці аглядзе і чакаць Санта-Клаўса. Для людзей і зямлі больш патрэбная жывая радасць і краса. Радасць, якая дапаможа нам жыць і змагацца ўвесь новы надышоўшы год!

ЗОРКА

Фота Ганны Кандрацюк

Калядоўшчыцы з Кляшчэль

Штогод жыхары Кляшчэль, якія прымаюць у сваіх дамах калядоўшчыкаў, маюць магчымасць паслухаць прыгожых калядак у выкананні сясцёр-блізнючак Ані і Касі Балейка. Дзяўчаткі вучацца ў VI класе падставовай школы. Яны выдатніцы па вучобе. Апрача таго ў іх шмат іншых зацікаўленняў. Прымаюць яны ўдзел ва ўсіх даступных ім спартыўных спаборніцтвах ды спяваюць. Спяваюць дома, у царкоўным хоры, у школе і асяродку культуры. У Гарадскім асяродку культуры спеву вучыць іх Ігар Фіта і яны ў многім яму абавязаны. На мінулагоднім конкурсе беларускай песні ў Бельску-Падляшскім занялі яны высокае II месца. З кляшчэлеўскім гуртом „Мікстура" выступалі яны не толькі на айчынных сцэнах, але і на Беларусі. Абедзве дзяўчынкі на дадатковых занятках у школе вывучаюць беларускую мову. Карыстаюцца ёю ў кантактах з некаторымі сямейнікамі, напрыклад з бабуляй, якая жыве ў Беларусі. У іх родным доме пастаянным госцем з'яўляецца „Ніва". Самыя любімыя прадметы Ані гэта фізкультура, музыка, пластыка і матэматыка. Дзяўчынка іграе на піяніна і гітары. У будучым хацела б стаць спартсменкай або спявачкай. Яе сястра Кася ў школе аддае перавагу матэматыцы, фізкультуры і польскай мове. Плануе стаць акцёркай або добрай спартсменкай.

Абедзвюм сёстрам сардэчна жадаем паспяховага здзяйснення іх жыццёвых планаў. А ў час каляднага перыяду чакаем ад іх новай, прыгожай калядкі.

М. Ц.

Міра ЛУКША

Казёл з Казлоў

— Ну, ты казёл! — Казлу сказалі,
Бы ў бародку наплявалі.
Ці меў пакрыўдзіцца на іх,
Двухногіх, усмешліва-крывых?
Схаваўшы крыўду ў бараду,
Бэкнуў Казёл: „Ну, я іду!
Калі я „бэ", дык вам дулю!
Не просты я казёл — а Барадулін!
Мяне шануюць ў Рагачах!
І ў Козліках наводжу страх,
Хоць не страшу і не пугаю.
Бывае, што за глупствы лаю,
Але ж нікога не бадаю!"
Вам, даражэнькія, параю:
Казлоў нам трэба шанаваць!
І ў Казлы ў госці заязджаць!

Зося з першага „а” класа

— 14 —

На Каляды Зося паехала да бабулі ў вёску. Дзяўчына хацела адпачыць ад школы і горада. Пасля апошняга ўрока яна села ў цягнік і паперлася ў Смальніцу. У бабулінай вёсцы было больш снегу чым у горадзе. Зося ўзяла стары мяшок, напхала ў яго сена і пайшла на ім катацца, як у дзіцячыя гады. Яна з'язджала з высокай гары больш за дзве гадзіны, аж стала горача і весела.

Раптам яна пабачыла нейкага мужчыну. Чалавек выйшаў з лесу. Зося схавалася за дрэва, каб назіраць за незнаёмым. Мужчына ішоў у бок бабулінай хаты. „Што гэта за тып? — думала яна. — Я, здаецца, яго раней не бачыла? Можа вярнуцца ў хату і пабачыць ці ўсё там у парадку?”

У хаце высветлілася, што мужчына — далёкі сваяк сям'і, Анрэйка. Яго не бачылі тут больш за дваццаць гадоў. Андрэйка ўжо трэці тыдзень блукаўся па людзях, праўдападобна хаваўся ад сваёй шлюбнай жонкі. Ён прасіў па чарзе ў сваякоў прытулку. А вось зараз прыйшоў час і на бабулю. На жаль, Андрэйка быў вельмі дакучлівым госцем. Ужо тры тыдні бадзяга не мыўся і не мяняў вопраткі, а да таго не ўмеў сказаць разумнага слова пра самога сябе і сваю сям'ю. Раз ён казаў, што ў яго чатыры дачкі і адзін сын, іншы раз — што тры сыны і адна дачка... Ну, чысты смех! За калядным сталом ён таксама гаварыў абы-што, апавядаў як патрапіць *бушаваць* усю ноч у інтэрнэце.

„Не дзіва, што ў яго праблемы з жонкай!” — падумала Зося. Дзядзьку Андрэйку пераапранулі за Санта-Клаўса. Каб атрымаць свой падарак, Зося была вымушана праспяваць калядку. Сваяку вельмі спадабалася дзяўчына. Ён адразу папрасіў у яе нумар мабільніка. Зося, вядома, хацела падражніцца са смешным дзядзькам. І, доўга не думаючы, запісала яму выпадковы нумар са сваёй мабілы...

— Я буду пісаць табе, прыгажуня, эсэмэскі кожны дзень! — сказаў Андрэйка.

— Калі ласка! — захіхікала Зося.

Тут трэба дадаць, што выпадковы нумар не быў выпадковым. Зося беднаму Андрэйку чамусьці запісала нумар Клары. Праўда, яна крыху спалохалася, зразумела, што з ёю дзеецца нешта дурное. Наступная думка яшчэ больш яе напалохала: „А можа вінаваты тут Паўл Пятрушэня?!”

Тэкст: wodorotlenek92@wp.pl
Дызайн: majeszkorowu@tlen.pl

Вершы Віктара Шведа

Кім у жыцці быць хочам?

На ўроку рысавання
Маем мы час рабочы.
— Прадстаўце,— просіць пані,
Кім у жыцці быць хочам.

І быццам хтось сурочыў,
Сядзіць адна дзяўчына.
— А кім у жыцці быць хочаш?
— Замужняю жанчынай.

Дамашні ліфт

Жыхар новага дома,
З прычыны невядомай,
Не ліфт, а толькі сходы
Выбірае заўсёды.

На пытанне — сцвярджае:
— Ліфт пяць асоб забірае.
Я не магу дачакацца
Каб маглі ўсе сабрацца.

Музыка з кайфам

Калядкі на каляды

Калі я трапіла на апошнія каталіцкія святы ў сталічны Мінск, зацікавіла мяне вялікая актыўнасць беларускіх музыкаў. Падумала сабе: чаму ў нас няма такіх калядных канцэртаў? Калядны канцэрт не мусіць састаўляць толькі і выключна калядкі, бо самай важнай з'яўляецца атмасфера, настрой ды ахвота слухачоў гуляць і быць разам у так асаблівы перыяд.

На гэтыя святы ў мінскія канцэртныя залы слухачоў прывялі „Палац”, „Троіца” ды агляд хрысціянскіх гітоў. Мне ўдалося наведаць Маладзёжны тэатр эстрады, каб паслухаць гурт „Палац”, а дзякуючы музычнай цікавасці заглянула я і ў Чырвоны касцёл паслухаць як выступоўцы спяваюць беларускія хрысціянскія гіты. Там якраз прыцягнула мяне перш за ўсё асоба Андрэя Мельнікава, знакамітага барда, які не раз наведваў фестываль „Бардаўская восень” у Бельску-Падляшскім. Варта было, бо Андрэй Мельнікаў зайграў свае самыя кранальныя песні, у якіх пераплятаюцца тэмы Бога, радзімы ды чалавечага лёсу. Канцэрт сабраў поўную залу ў падвале славутага беларускага касцёла, які ў Беларусі з'яўляецца сапраўдным бастыёнам беларускай мовы.

Пра канцэрт „Троіцы” даведалася я дзень пазней, але 25 снежня пабывала на музычнай сустрэчы з гуртом „Палац”, які за гэтыя святы зайграў два канцэрты: на Куццю і ў першы дзень Каляд. На кожным канцэрце зала была поўная. Прыемна было глядзець, калі пасля канцэрта да Алега Хаменкі, лідара гурту, падыходзілі слухачы розных узростаў, віншавалі з канцэртам, прасілі даць аўтограф ці дзякавалі за магчымасць паслухаць беларускую мову. А сам канцэрт? Быў напэўна незвычайны. Паяўляліся самыя прыгожыя песні ў новых аранжыроўках, музыкі часам уцякалі ў іншыя, чым толькі фольк, жанры музыкі. Было крыху фанку, джазу, фолькмадэрну, але перш за ўсё вялікая ангажаванасць музыкаў і вернай публікі, якая на канец апладзіравала стоячы. Святочнага настрою дабаўлялі таксама адмысловая дэкарацыя і цудоўная ілюмінацыя.

Святочныя канцэрты гэта класная ідэя не толькі таму, што можна адарвацца ад стала, але перш за ўсё таму, што можна сустрэцца з людзьмі, якія адчуваюць святы ў падобны спосаб.

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 2

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 50:

Струк, авад, слон, слоўнік, гамонка, Ева, но, план. Ягня, тур, смех, слова, калона, воўк, ванна, на, склон.

Узнагароды, кніжку **„Муха ціп-топ”**, выйгралі **Юстына Вакулюк, Крыстыян Грушэўскі** з Арэшкава, **Адрыян Ігнацюк** з Чыжоў, **Іаанна Галёнка** з Дубін. Віншуем!



Успамін пра старую і новую Луку

Віктар БУРА

Мой суразмоўца Мікалай Стоцкі, сын Максіма і Вольгі Сабэцкай, нарадзіўся 16 чэрвеня 1929 года. У 1939 г. скончыў чатыры класы падставовай школы ў Луцэ. Тады вёска называлася Лука над Нарвай і знаходзілася ў Тарнопальскай гміне Ваўкавыскага павета.

— У 10-гадовым узросце спасцігла мяне вайна. Памятаю як пачалася ўсеагульная мабілізацыя. У першую чаргу ў паляўнічых, гаёвых і леснікоў адабралі ружжо. Войтам тады быў Яўген Шыманчук з Семяноўкі, сакратаром — Півонскі, а яго памочнікам — Назарка з Ціванюкоў. На той час апошні быў найбольш адукаваным чыноўнікам.

У 1940 годзе ў нас была савецкая ўлада. У Луцэ быў сельсавет, а яго старшынёю выбралі Сцяпана Кавалеўскага — самага беднага чалавека ў Луцэ. Ягоны сын Сцяпан належаў да камсамола. Школу ўзначальваў Матэйчык з Юшкавага Груда. Я зноў пайшоў у школу, у 4-ы клас. Вучыў нас Васіль Боўтрык (Гяложаў) з Боўтрыкаў. Пазней прыслалі настаўнікаў з Беларусі — адзін з іх хіба называўся Анхітаў. Тады я закончыў 5 класаў.

У 1941 годзе напалі немцы. Вайна. Гітлераўцы завялі свае парадкі, устанавілі пастарунак нямецкіх жандараў. Было іх каля 15 чалавек. Праводзілі яны чыстку, лавілі камуністаў, камсамольцаў і ўсіх тых, хто служыў савецкай уладзе. На першы агонь пайшлі наступныя жыхары Лукі: Марыя Новік (дачка Юльяна, камсамолка), Уладзімір Лаўнічук (сын Юзафа), Сцяпан Кавалеўскі (сын старшыні сельсавета, камсамолец), Іван Жукоўскі (сын Дзмітрыя, камсамолец), Цімафей Новік (дзесятнік), Юзаф Васільчык (падсолтыс), Юзаф Васільчык (сын Мікіты, дзесятнік), Мікалай Стоцкі (сын Якуба, камсамолец), Райка і Зіна (прозвішчаў не помню). Ужо на другі дзень пасля расправы жыхары вёскі даведаліся пра месца іх расстрэлу. Пасля гэтай трагедыі сем'і забітых пры вялікай асцярожнасці перапахавалі іх на могільнік у Ляўкове. Спіс прызначаных да экзекуцыі падрыхтавалі немцам былы солтыс Тарнопаля Гайдучэня і былы старшыня сельсавета ў Луцэ Сцяпан Кавалеўскі. Неўзабаве савецкія партызаны за здрадніцтва расстралялі Гайдучэню з сынам.

Нямецкі пастарунак змяшчаўся ў частцы школы і ў хаце Лявона Лобача. Немцы загадалі вяскоўцам трымаць г.зв. начныя варты для аховы вёскі ад партызан. Вартавалі па два чалавекі. У вёсцы былі завешаны кавалкі рэек, у якія трэба было біць на трывогу ў выпадку пажару, надыходу партызан ці іншай небяспекі. Калі варту трымалі Антон Харкевіч і Харлампій Драўноўскі, у вёску да Ёзіка Лаўнічука на коратка зайшлі партызаны. Вартавыя пачалі званіць у жалязякі. Партызаны ўміг пакінулі вёску. Жандары, даведаўшыся, што партызаны былі ў хаце Лаўнічука, ачапілі яе, каб узяць іх жывымі. Аказалася, што партызан ужо не было. Праз некалькі дзён партызаны наведалі хаты тадышніх вартавых і зрабілі ім такую лупцоўку, што з таго часу ніхто з вартавых не падымаў трывогу. А большасць лучан надалей дапамагала партызанам.

Фундатары званоў для Свята-Ільінскай царквы ў Новай Луцэ: Мікалай Стоцкі (у цэнтры) з сынамі Яраславам (злева) і Янам (справа)

У Луцэ пры немцах была 4-класная школа, у якой вучыў Мікалай Новік.

У вёсцы было двух кавалёў: мой бацька і Іван Харкевіч, а іх кузні знаходзіліся ў пачатку (Іванава) і канцы вёскі (наша). Пад канец вайны, калі немцаў гналі ўжо з-пад Масквы, праз вёску праехаў савецкі партызанскі абоз. Што было на фурманках, не ведаю, бо былі яны накрыты брызентам. Адна калона спынілася ў заходнім канцы вёскі, пры нашай кузні, другая — пры кузні Івана Харкевіча. Кавалям трэба было зрабіць падковы і перакаваць коней. Жыхары частавалі савецкіх салдат махоркай (а яны іх карашкамі), жартавалі, сустракалі іх дружалюбна.

Пасля вайны новая ўлада размясцілася ў Нараўцы. Мне тады было 15 гадоў і я дапамагаў бацьку на 12-гектарнай гаспадарцы. Былі ў нас 4 каровы, 2 коней, авечкі, свінні, гусі. Ну і была кузня. Кавальству бацька навучыўся ад свайго бацькі Максіма. Быў ён добрым майстрам, хаця не бачыў на левае вока. У маладосці, калі вазілі снапы ў клуню, ягоны бацька па неасцярожнасці штурхнуў яго ў левае вока. Але правым вокам вельмі добра і далёка бачыў. З адлегласці кіламетра распазнаваў чалавека, калі ён быў яму раней знаёмы.

Калі мне было 17 гадоў, бацька паслаў мяне да Уладзіміра Ляха ў Залешаны вучыцца валенню. Тады валёнкі былі вельмі папулярным абуткам і я іх вырабляў ажно да 1960-х гадоў. Рабіў я валёнкі розных колераў для мужчын, жанчын і дзяцей. Гэтаму рамяству ў мяне вучыліся Канстанцін Самоцік, Аляксандр Анцутка, Юрый Лукша, Васіль Стоцкі і іншыя. Апрача мяне ў вёсцы валёнкі вырабляў яшчэ Уладзімір Лобач.

У Луцэ многа было ганчароў. Выраблялі яны гаршкі, верцехі, збанкі і іншую хатнюю дробязь. Ганчарствам займаліся Рыгор Анцутка, Арсень Харкевіч, Юзаф Бірыцкі, Андрэй Анцутка і ягоны сын Аляксандр. Краўцоў у нас было восем. Найважнейшым майстрам, у якога гэтаму рамяству вучыліся многія лучане, быў Рыгор Харкевіч. Ён шыў усё — летнюю і зімовую вопратку, модна, густоўна, для кожнай фігуры. Вядомымі краўцамі былі таксама Якуб Смольскі і Аляксандр Трахімчук, а краўчыхамі — Марыя Харкевіч (дачка Аляксандра) і Анастасія Васільчык. Шавецтвам займаліся Восіп Лаўнічук, Аляксандр Новік, Канстанцін Новік, Уладзімір Харкевіч, рымарствам — Аляксандр Шульскі, Іван Шульскі, сталярствам — Сцяпан Каральчук і Іван Бойчук, рыбалоўствам — Юльян Жукоўскі, Герасім Васільчык, Вінцэнт Баршчэўскі, а пчалярствам — Рыгор Жукоўскі (сын Мікалая), Аляксандр Трахімчук, Аляксандр Анцутка, Мікалай Стоцкі, Канстанцін Самоцік. Былі ў вёсцы і таленавітыя музыканты — Васіль Новік, Васіль Трахімчук, Юрый Лукша. А фатаграфаваннем прафесійна на ўсю ваколіцу займаўся Якуб Смольскі.

Былі ў нашай вёсцы дзве крамы (кааператыўная і прыватная) ды сякая-такая святліца, у якой вельмі часта ладзіліся музыкі. Вясковая моладзь летнімі вечарамі прыгожа спявала на лавачках. Іх задушэўныя песні несліся па рацэ Нарве да іншых вёсак — Боўтрыкаў, Рыбакоў, Гарбароў.

Ажаніўся я ў 1954 годзе з Кацярынай Кіслай з Семяноўкі. З 1966 года сталі мы самастойна гаспадарыць. Пабудавалі абору памерамі 30 х 9,5 м. Трымалі мы 13 дойных кароў і 6 штук маладняку. Набылі ўсе асноўныя сельскагаспадарчыя машыны. Жылося нам штораз лепей, лягчэй.

Але з кожным годам штораз чутней сталі гаварыць пра будову штучнага вадасховішча. Плаціна мела быць узведзена на ўсходнім баку вёскі, а гэта абазначала, што Лука застанецца далей жыць. Але планавікам штосьці адмянілася і плаціну запраектавалі на захадзе вёскі, зараз за Рыбакамі. Такім чынам Луцэ быў вынесены прыгавор — высяленне. У нервах, неспакоі гаспадарыў я да 1973 года. У галаве ўсё мітусіліся думкі: што рабіць, як жыць далей? Ці падацца ў горад, у блокі, ці застацца верным зямлі, земляробству? Чыноўнікі арганізавалі вясковыя сходы, давалі прапановы, усведамлялі, раілі, падказвалі, што памалу трэба пакідаць гаспадарку, дамы, роднае.

Калі лучанам было аб'яўлена выбірацца з вёскі і дадзены былі прапановы куды хто можа выбрацца, я вырашыў далей гаспадарыць непадалёк ад сваёй вёскі. Падабраў я сабе аднадумцаў, добрых гаспадароў. Мы вырашылі трымацца разам і старацца атрымаць зямлю і ўчасткі пад забудову ў новым месцы. Такім чынам мы заснавалі Новую Луку. У ліку заснавальнікаў былі Сяргей Каральчук, Канстанцін Самоцік, Уладзімір Харкевіч, Ян Бойчук і іншыя. Я стаў солтысам. Ваяводскія ўлады неахвотна ставіліся да нашай задумы, але падтрымаў нас тадышні начальнік Нараўчанскай гміны Юзаф Навіцкі. Прыехаў ён да мяне як да солтыса з прапановай выбраць месца пад будаўніцтва. Мы выбралі лучанскае ўрочышча Хваіны. Два тыдні пазней Бюро праектаў прад'явіла нам два праекты забудовы. Мы прынялі першы праект і сталі рыхтавацца да перасялення.

З 1988 года я стаў гаспадарыць на новым месцы. Першымі ў Новай Луцэ пабудаваліся Сяргей Каральчук, Канстанцін Самоцік, Уладзімір Харкевіч і я. У 1991 годзе я перадаў зямлю сынам — Яну (пабудаваўся ў Ляўкове) і Яраславу, які ўжо 17 гадоў гаспадарыць у Новай Луцэ. Пабудаваў ён механізаваную абору, трымае 30 дойных кароў. У аборы 20 месц для маладняку. У яго танк на 750 літраў малака, усе неабходныя сельскагаспадарчыя машыны. Весці гаспадарку дапамагае яму жонка Данута, якая таксама мае вышэйшую адукацыю.

На лучанскіх палях было мноства камянёў рознай велічыні. У пачатку XX стагоддзя прыехалі каменябойцы, каб сабраць камяні і апрацаваць іх для чыгуначных мэт. Пасябравалі яны з вяскоўцамі і ў 1904 годзе дапамаглі ім устанавіць на камяні жалезны крыж. Пры ім лучане астанаўліваліся, праводзячы ў апошнюю дарогу пакойнікаў. У 1985 годзе гэты крыж перанесены быў да Новай Лукі і ўстаноўлены на пачатку вёскі.

Жыхары Новай Лукі належаць да прыхода ў Ляўкове. Наш стары бацюшка Леанід Янкоўскі, калі наведваў з малітвай нашу вёску, выявіў, што ў яго душы нарадзілася задума пабудаваць царкву ў нашым лесе. Мы яго думку прынялі з вялікім задавальненнем. Для нас быў гэта гонар пабудаваць сабе царкву. Выбралі мы грамадскі камітэт пабудовы, у які ўвайшла і наша сям'я. Да пабудовы царквы найбольш спрычыніліся такія лучане як Канстанцін Самоцік, Фёдар Харкевіч, Уладзімір Харкевіч, Сяргей Каральчук, Мікалай Стоцкі, Іван Бойчук. Вялікі ўклад унеслі таксама рабочыя Керамічнага прадпрыемства з Ляўкова з яго старшынёю Аляксандрам Бандаруком на чале. Наша сям'я 9 лютага 2004 года заказала ў фірме Збігнева Фэльчынскага з Тацішава тры званы: 70 кг з іконай св. Серафіма, 40 кг з іконай св. Ільі і 27 кг з іконай Божай Маці. На кожным зване адліты надпісы з інфармацыяй пра донараў — сям'ю Стоцкіх і пажаданнямі здароўя для іх. За званы сваімі грашыма заплаціў і на сваім транспарце іх прывёз мой сын Яраслаў.

Асвячэнне нашай царквы, нябесным заступнікам якой з'яўляецца св. прарок Ілья, адбылося 17 верасня 2005 года. На ўрачыстасць прыбылі праваслаўныя іерархі, свяшчэннікі і колішнія жыхары былой Лукі, якая ў свой час налічвала больш за 140 дамоў.

На канец нашай размовы спытаў я Мікалая Стоцкага ці не шкадуе ён старой вёскі Лукі, рэчкі, палеткаў з цікавымі назвамі, расспяванай лучанскай моладзі. Мікалай, прызадумаўшыся, адказаў: „Блізкі мне гэты свет, былая вёска Лука, што пад вадой".

Праваслаўны святар Андрэй Туроўскі

Сяргей ЧЫГРЫН

Нядаўна на старонках „Нівы” было змешчана маё інтэрв’ю з цікавым і таленавітым беларускім музыкаведам, тэлежурналістам, педагогам, кандыдатам філасофскіх навук Данатам Яканюком (нарадзіўся ў Орлі, жыве ў Мінску) — унукам беларускага святара Андрэя Туроўскага. Падчас гутаркі спадар Данат згадаў пра свайго дзеда — святара Андрэя Туроўскага. Мяне так зацікавіла гэтая асоба, што прамінуць яе я не змог. Хаця і раней ведаў і чуў пра Андрэя Туроўскага, нават пра яго чытаў згадку ў выдатнай кнізе а. Рыгора Сасны і Дарафея Фіёніка „Orla na Podlasiu”, якую выпусціла Беларускае гістарычнае таварыства ў 1997 годзе.

У зборах матэрыялаў і згадак пра Андрэя Туроўскага мне вялікую дапамогу аказаў усё той жа Данат Яканюк. З яго вуснаў і з вуснаў іншых Яканюкоў-Туроўскіх я шмат даведаўся пра нашага цудоўнага праваслаўнага святара.

Нарадзіўся Андрэй Туроўскі 17 кастрычніка 1890 года ў Шчэбрэшыне, на Заходняй Украіне, у той яе частцы, якая была пад Польшчаю (цяпер Шчэбжэшын Люблінскага ваяводства — рэд.). Яго бацька, Фёдар Туроўскі, быў праваслаўным святаром. Пасля Шчэбрэшына і Холма меў ён прыходы ў Заходняй Беларусі — Кленіках, Мілейчычах, Ялоўцы і Орлі. Маці Кацярына была з роду заможнай польскай шляхты Кушэвічаў. Перад шлюбам Фёдара і Кацярыны, яна перайшла ў праваслаўе. У іх нарадзілася пяцёра дзяцей — Марыя, Аляксандра, Сцепаніда, Мікалай і Андрэй.

Андрэй, як сын святара, паступіў і выдатна закончыў семінарыю, магчыма, кіеўскую. Аднак спачатку да святарства не імкнуўся. Паступіў і два ці тры гады вучыўся ў Кіеўскім універсітэце, але не закончыў, бо пачалася Першая сусветная вайна. Яго сябра Пётр Гундзяеў (сын маскоўскага двараніна Архіпа Гундзяева, яго брат у 1890-я гады быў губернатарам польскага горада Сандоміра), вучыўся ў тым жа Кіеўскім універсітэце. Таму ў 1915-1916-х гадах Андрэй і апынуўся ў Маскве, дзе пазнаёміўся з Аляксандрай — сястрой Пятра Гундзяева...

Андрэй Туроўскі, па словах Даната Яканюка, валодаў рускай, польскай, украінскай, беларускай, грэчаскай і лацінскай мовамі, чым і прывабіў прыгожую, усмешлівую дзяўчыну, якая прадставілася Шурай. Пазней, калі святар Туроўскі служыў у Гродзенскай кансісторыі з 1934 па 1939 гады, любіў сустракацца з прафесарам лацінскай мовы Гродзенскай гімназіі, каб пагаварыць на старой лацінскай мове.

Андрэй быў музычна адораным, бліскуча іграў на скрыпцы, раялі, гітары, быў цудоўным дырыжорам хору. У Брэсце, куды вымушаны быў уцячы з Масквы ад бальшавікоў з маладой жонкаю Аляксандрай, ён працаваў пэўны час у нейкай бухгалтэрыі, але змог арганізаваць хор пры Брэсцкім царкоўным прыходзе і кіраваў ім да 1920 ці 1921 года, калі быў рукапаложаны ў сан святара.

Малодшая дачка святара Ганна (цяпер жыве ў Вільні) успамінае, што ў Маскве, падчас рэвалюцыі, Андрэя Туроўскага схапілі на вуліцы „як інтэлігентна апранутага” мужчыну, паставілі да сцяны разам з іншымі такімі ж звонку „контррэвалюцыянерамі” і ўжо прыгатаваліся да расстрэлу. Але побач ішоў знаёмы Андрэя па ўніверсітэце, які „стаў бальшавіком”, вывеў з шарэнгі прыгавораных, даў яму дакумент, у якім пазначыў, што Андрэй Туроўскі працуе ў Маскоўскай рэвалюцыйнай установе (са штампам). Гэта і выратавала Андрэя. Гэты дакумент і дапамог пераправіцца з Масквы ў Брэст з маладой жонкаю Аляксандрай, якая ў Маскве пакінула сваіх родных і знаёмых. Так апынуліся Андрэй і Аляксандра Туроўскія ў Польшчы. Там, у Брэсце, нарадзіліся ў іх дзве дачкі: Варвара (1918 г.) і Ала (1921 г.). У Брэсце Андрэй Туроўскі быў рукапаложаны (Туроўскаму быў дадзены святарскі сан). Яму прапанавалі „свой” прыход у Кленіках, куды з Брэста сям’я Туроўскіх і пераехала. Потым Андрэй Туроўскі быў настаяцелем цэркваў у Мілейчычах, дзе нарадзілася малодшая яго дачка Ганна, і ў Ялоўцы, дзе з’явіўся на свет Божы доўгачаканы сын Віктар. „І паўсюдна мой дзед садзіў сады. А прыходы з яго ўдзелам станавіліся самымі вялікімі і заможнымі. Да яго людзі ішлі па парады, як да „міравога суддзі”, — расказвае Данат Лявонавіч.

У 1930 годзе Андрэй Туроўскі быў пераведзены ў Гародню, але свайго прыхода не меў. Служыў у Гарадзенскім саборы і ў Кансісторыі, а ў 1935 годзе атрымаў свой прыход у занёманскім храме (царква дзейнічае і цяпер). З яго прыходам у царкву — там і ў акрузе ўсё змянілася. Святар Туроўскі адрамантаваў царкву, пасадзіў сад. На яго пропаведзі збіралася шмат мясцовых жыхароў занёманскага раёна Гародні, шматкроць павялічыліся ахвяраванні прыхаджан, большасць якіх была рабочымі гарадзенскай тытунёвай і кардонавай фабрык, шклозавода.

У Кансісторыі ён вёў справы сувязі Гарадзенскай епархіі з рознымі свецкімі ўстановамі польскай адміністрацыі. У Гарадзенскім архіве Данат Яканюк знайшоў шмат дакументаў, напісаных па-польску, па-руску рукою дзеда ў розныя інстанцыі паводле скаргаў, рамонту цэркваў у рэгіёне і г.д. Шмат энергіі Андрэй Туроўскі страціў, каб не даць разбурыць прыгожую цагляную праваслаўную Уладзімірскую царкву на цэнтральнай плошчы Гародні, тады імя Пілсудскага (потым імя Леніна, а зараз імя Тызенгаўза). Аднак царква была разбурана польскімі ўладамі.

І характар, і выхаванне, і, адпаведна, пасада Андрэя Туроўскага стварылі яму „славу” чалавека мудрага, памяркоўнага, з якім можна параіцца па любых жыццёвых пытаннях. З ім падтрымлівалі прыязныя адносіны нават святары касцёлаў, а таксама рабін гродзенскай сінагогі, мясцовыя багатыя яўрэі (Гародня ж была ў межах яўрэйскай аселасці з часоў імператрыцы Кацярыны II). Яны потым, па словах Даната Яканюка, падчас бальшавіцкіх рэпрэсіяў і дапамаглі дзеду з’ехаць, вярнуцца з Гародні на Беласточчыну, у Орлю.

Падчас прыходу ў Гародню Чырвонай Арміі восенню 1939 года сям’ю Туроўскіх ледзьве не расстралялі чырвонаармейцы (калмыкі). З Усходу на Гародню ішлі савецкія танкі, некалькі з іх спынілася каля царквы. Невялікая група жыхароў з чырвонымі павязкамі на рукавах і кветкамі сустракалі чырвонаармейцаў. Раптам пачуліся стрэлы, усе гарадзенцы кінуліся хто куды. Калмыкі акружылі дом і царкву. Вывелі з сутарэнняў сям’ю айца Андрэя і двух старых (вартаўніка і старасту царквы) ды наставілі кулямёт для расстрэлу. Але рускі афіцэр крыкамі спыніў „акцыю”. Пасля вобыску царквы (канешне, нічога і нікога не знайшлі), адпусціў усіх: „Иди, батя, тебя и твоих не тронут...”.

Занёманская царква за саветамі апусцела, Кансісторыя была зачынена. Андрэя Туроўскага некалькі начэй запар вазілі „чорным воранам” у мясцовае НКВД на допыты, якія святар (ён перанёс у 1932 годзе інфаркт) вельмі цяжка перажыў. На допытах спрабавалі высветліць яго „афіцэрскае” мінулае. Але выратавала старая паперка-дакумент, які быў выдадзены святару Андрэю Туроўскаму яшчэ падчас рэвалюцыі і грамадзянскай вайны ягоным сябрам, з якім Андрэй Туроўскі вучыўся ў Кіеўскім універсітэце. У дакуменце значылася, што ён, Андрэй Туроўскі, з’яўляецца супрацоўнікам нейкай бальшавіцкай установы. Гэты дакумент і выратаваў протаіерэя Туроўскага тады ў другі раз, у Гародні. Са здзіўленнем энкавэдэшнікі прачыталі дакумент, папрасілі прабачэння і адпусцілі дахаты.

Тым не менш, сям’я была „запісана” на высылку ў Сібір, пра што паведаміў Андрэю Туроўскаму нейкі служачы з гарадзенскай управы (знаёмы гарадзенскі яўрэй, былы шавец) і параіў з’язджаць з Гародні. Так святар і паступіў. Ранняй вясною 1940 года яўрэі дапамаглі справіць вагон для пераезду, і ўся сям’я з рэшткамі маёмасці і мэблі пераехала ў Орлю. Там і сустрэла нямецкую акупацыю. У Орлі часоў 1940-га года было дынамічнае і заможнае жыццё. Мястэчка ўпрыгожвала мясцовая сінагога са школай рабінаў, было шмат крамаў, майстэрняў, дзе панавалі мясцовыя яўрэі і ўвогуле спраўна вялі жыццёвы арлянскі рэй. Усё можна было купіць ці „дастаць”.

І тут протаіерэй Андрэй Туроўскі стаўся вядомым чалавекам у арлянскай акрузе. Споведзі прыхаджан як бы „працягваліся” і па-за царквой. Да яго прыходзілі людзі па параду, праз знаёмых ён дапамагаў з уладкаваннем на працу. Яго дом пры царкве быў своеасаблівым „клубам” мясцовай моладзі (на выданні ж былі яго тры дачкі-прыгажуні). Матухна Аляксандра Туроўская была завадатарам хатніх вечарын, гатавала неверагодна смачныя стравы на праваслаўныя святы (яна была выпускніцай Інстытута шляхетных дзяўчат, дзе вучылі разнастайным кулінарным „таямніцам”).

Падчас нямецкай акупацыі ў Орлі было няшмат немцаў. Яны таксама з пэўнай павагай ставіліся да праваслаўнага святара, якога паважалі мясцовыя жыхары, на той час ужо ў асноўным беларусы. І акупанты гэта ўлічвалі.

Калі пачаліся арышты мясцовых яўрэяў (зганялі на будаўніцтва шашы), айцец Андрэй шмат каго з іх выратаваў, пераконваў нямецкую адміністрацыю (кіраўніком быў сталы немец, былы настаўнік), што сёй-той яўрэй „жыццёва патрэбны”, каб падтрымліваць тутэйшы побыт (майстэрні шаўцоў, дробныя гандляры і пекары). І калі-некалі той немец „заплюшчваў вочы” на тое, што некалькі дзесяткаў мясцовых яўрэяў жывуць па-за гета. Невядома, ці пазбеглі тыя яўрэі ўсё ж канцэнтрацыйнага лагера...

Тут, у Орлі, у Андрэя Туроўскага абвастрылася хвароба сэрца, якую мясцовыя лекары лячылі ўколамі... морфію. Такое тады было лячэнне!

Тут, у Орлі, Андрэй Туроўскі стаў дзедам, бо яго старэйшая дачка Варвара, якая выйшла замуж за мясцовага беларуса, пекара Лявона Яканюка, нарадзіла 10 лютага 1944 года сына Даната. Яму Андрэй Туроўскі і даў гэтае імя і ахрысціў у Арлянскай царкве, дзе быў настаяцелем. (Дарэчы, менавіта ў гэты ж дзень Андрэй Фёдаравіч напісаў ноты харавой песні — рукапіс захоўваецца ў сямейным архіве Даната Яканюка).

У гэты ж час у Орлі памерла маці айца Андрэя — Кацярына Туроўская.

Неўзабаве прыйшло вызваленне — наступ Чырвонай Арміі. Орля некалькі разоў пераходзіла з рук у рукі.

Хутка ў Бельск (10 км ад Орлі) прыехаў архіепіскап Васіль з Мінска і свята цывільных, сярод якіх быццам быў дырэктар мінскага банка і нейкі малады. Усе агітавалі на пераезд у БССР (як вядома, паводле „волі” Сталіна, Беласточчына пасля вайны перайшла да Польшчы). Прапанавалі „заможнае і вольнае” жыццё ў савецкіх калгасах, працу на заводах і г.д. У Бельск на сустрэчу архірэй запрасіў Андрэя Туроўскага і прапанаваў таксама агітаваць прыхаджан на пераезд (архірэй ведаў Туроўскага па працы ў Кансісторыі, пра вялікую павагу людзей, якой айцец Андрэй карыстаўся на Беласточчыне). Як стала вядома потым, той архірэй быў супрацоўнікам НКВД (са слоў малодшай дачкі Андрэя Туроўскага — Ганны).

Прапанова была на той час неблагая: прыход у царкве, якая захавалася ў Мінску, кватэра ў цэнтры горада, вучоба ці праца дзяцей. Паводле казанняў-прапаноў айца Андрэя ў Арлянскай царкве перасяленцамі сталася некалькі беларускіх сем’яў. Многія з іх жывуць зараз у Гародні. Тады, у 1940-я гады, нават раён Гародні так і называўся Пярэсялка. „І там памяталі айца Андрэя доўга. Напрыклад, сям’я Ясюкоў, якія былі прыхаджанамі Арлянскай царквы, слухалі казанні і службы айца Андрэя. І вось ён, непрадказальны лёс: з сынам Янкі Ясюка — Аляксандрам я вучыўся ў адной гарадзенскай школе № 3, сядзеў за адной партай, сябраваў і сябрую дагэтуль! Але пра тое, што Ясюкі былі прыхаджанамі майго дзеда, даведаўся праз шмат гадоў, напрыканцы стагоддзя...”, — распавядае Данат Яканюк.

Так ранняй вясной 1945 года сям’я Туроўскіх з’явілася ў двух вагонах на пероне Мінскага вакзала. А вакол быў поўнасцю разбураны Мінск. Айцец Андрэй сабраўся з сіламі і пачаў служыць у той „хатняй” царкве. Яго малітвы і казанні былі вельмі шчырымі, адкрытымі, прыгожа прамоўленымі (музыкант жа!) спакойным, прыгожым жа голасам. Неўзабаве ў царкве стала з’яўляцца шмат вернікаў. У святы прыходзіла столькі народу, што прыходзілася стаяць у двары. А калі прыход сабраў больш грошай на Чырвоную Армію, чымся прыход таго архірэя, дык той нават абурыўся.

Андрэю Туроўскаму тым часам станавілася ўсё горш і горш. На дапамогу яму прыехаў з Варшавы святар Жук. Аднойчы айца Андрэя выклікаў да сябе архірэй, але а. Андрэй ужо не змог падняцца з ложка, і пайшоў за яго Жук, які і перадаў архірэю, што Туроўскі моцна хварэе. Замест спачування, той злосна крыкнуў: „Один лежит, другой гуляет, церковь закрываем, служб не будет!”. Гэта Жук і перадаў Андрэю Туроўскаму. Тая вестка і была апошняй „куляй”, што дабіла протаіерэя Туроўскага. Ён памёр 12 чэрвеня 1945 года ў Мінску ў доме ля царквы, дзе служыў апошнія месяцы жыцця (на рагу вуліц Савецкай і Мяснікова ля Дома ўрада, там зараз газон). На пахаванні былі ўсе святары Мінска, акрамя таго архірэя. Прыйшло шмат народу — прыхаджан той царквы.

Пахаваны Андрэй Фёдаравіч Туроўскі на Вайсковых могілках у Мінску леваруч ад уваходу ў Аляксандра-Неўскую царкву. Праз некалькі гадоў (у 1951 годзе) без згоды родных, побач у агароджы (якую на свае грошы заказала матухна Аляксандра Туроўская і якую рассунулі), пахавалі яшчэ і протаіерэя Раждзественскага. Два гады таму, у 2006 годзе, царква за свой кошт паставіла аднолькавыя мармуровыя надмагільныя пліты з выбітымі імёнамі двух протаіерэяў — Туроўскага і Раждзественскага.

„Галерэя Ады” ў Вільні

У Вільні, 27 снежня 2008 г., у Таварыстве беларускай культуры ў Літве ў чарговы раз сустрэліся беларусы, каб адзначыць Каляды і Новы год ды павіншаваць адзін аднаго са святамі. Галоўнай падзеяй віленскай сустрэчы была прэзентацыя ўжо вядомага ў Беларусі і свеце дакументальнага фільма „Галерэя Ады” Уладзіміра Коласа пра грамадскую актывістку Аду Райчонак з удзелам самой гераіні.

У зале ТБК

Выступае Ада Райчонак

Перад прэзентацыяй стужкі адбыўся нечарговы сход ТБК, на якім разглядаліся арганізацыйныя пытанні адносна стварэння беларускага культурнага цэнтра імя Якуба Коласа ў Вільні. Так, доўгія дваццаць год змаганняў у рэшце рэшт прынеслі свой плён (відаць, ужо ніхто ў гэта не верыў), і музей-цэнтр класіка беларускай літаратуры пачынае сваё існаванне. Безумоўна, галоўнае наперадзе: гэта і збіранне і адваяванне ў іншых музеяў экспанатаў, гэта і ўзвядзенне будынка, пошук грашовых сродкаў і ахвярадаўцаў, — але справа па ўвекавечванні памяці песняра на Віленшчыне зрушылася і стала не прывідам, а рэальнасцю. Аддаць належнае варта старшыні ТБК Хведару Нюньку, які ўвесь гэты доўгі час вёў зацятае змаганне за адкрыццё музея і, не страціўшы надзеі, перамогшы ўсе непаразуменні і перашкоды, здзейсніў сваю чарговую мару па захаванні беларускасці ў Літве.

Быў і яшчэ адзін прыемны момант: сябра рады ТБК Алесь Трусаў атрымаў віншаванні з нагоды чарговага свайго дня народзінаў.

У госці быў запрошаны ўкраінскі ансамбль „Світлиця”, які павіншаваў беларусаў са святамі і праспяваў калядкі на ўкраінскай мове. Вельмі прыемны момант, што ў Таварыства ўсталёўваюцца з гэтым ансамблем і ўкраінскімі сябрамі цёплыя адносіны. Гэта ўжо не першае выступленне ў ТБК. Яны ж выступалі і на святочным канцэрце ў Вільні, прысвечаным 90-годдзю абвяшчэння БНР.

Ну і вядома ж, як і пісалася ў пачатку, самай галоўнай падзеяй вечарыны была прэзентацыя стужкі „Галерэя Ады”. Варта адзначыць, што гэты фільм заваёўвае ўсё большую і большую папулярнасць: ён атрымаў галоўную ўзнагароду на VIII Міжнародным фестывалі крэатыўных дакументальных фільмаў „Escales Documentaire” ў французскім горадзе Ля-Рашэль. Але гэта была не адзіная перамога! Перад гэтым на тэлефестывалі „Залаты бубен” у Ханты-Мансійску (Расея) стаў лаўрэатам у катэгорыі „Нацыянальны характар”, а 24 кастрычніка 2008 г. заняў першае месца ў катэгорыі „Найлепшы рэгіянальны нізкабюджэтны дакументальны фільм” на конкурсе „Europa Prix” у Берліне.

Аб стварэнні фільма, аб тых цяжкасцях, з якімі сутыкаліся стваральнікі, апавядалі рэжысёр і аўтар Уладзімір Колас ды галоўная гераіня Ада Райчонак, якая крыху распавяла пра сябе, пра свой нялёгкі жыццёвы шлях, пра тое, што яе звязвае з Вільняй і беларусамі гэтага Вечнага Горада.

Гераіня фільма — Ада Райчонак, вясковая настаўніца, якая падчас Другой сусветнай вайны выжыла ў Віцебскім гета, а сёння ў звычайнай вёсцы Германавічы (былым мястэчку), што на Шаркаўшчыне, займаецца культурнай дзейнасцю. Гэтая стужка перад усім аб лёсе чалавека, аб яго супрацьстаянню знешняму асяроддзю і непаразуменню з ім, аб тым, што чалавек у любой сітуацыі можа рабіць прыгожае, велічнае, калі ён гэтага пажадае; яна і аб тым, як чалавек зламаны жыццём і абставінамі можа падымацца і ісці далей, несучы ў гэтае шэрае і змрочнае вясковае жыццё нешта іншае, больш значнае, чым інстыктыўнае існаванне жыцця ад заробку да заробку, і ў чарговы раз сведчачы аб вечнасці і непераможнасці мастацтва.

Праглядаючы стужку, мы пераносімся ў звычайную вёску, з яе бытам, праблемамі, радасцямі... Бачым чалавека з глыбінкі і тое, што яго хвалюе. І на фоне гэтага яна, былая настаўніца, уклініваецца ў гэтае стандартнае існаванне і спрабуе яго змяніць.

Ада Райчонак стала стваральніцай чатырох музеяў — гэта вялізны ўклад у захаванне спадчыны ў рэгіёне. Яна займаецца грамадскай дзейнасцю. І вось апошнія 15 год праводзіць мастацкія пленэры. Адзін з такіх пленэраў 2007 г. і пакладзены ў аснову сюжэта стужкі. І тут аўтар вельмі ўдала спалучае дзве лініі — жыццё сялян, іх быт, і творчую інтэлігенцыю — у адну. Тут яны перасякаюцца і цягам гадзіны вядуць супольнае суіснаванне і, сутыкаючыся адзін з адным, паказваюць найбольш вострыя праблемы сённяшняй беларускай глыбінкі і яе насельнікаў, іх канфлікт са светам культуры, мастацтва (іншага, чужога ім светапогляду). І гераіня фільма спрабуе прымірыць гэтыя дзве лініі, хоча, каб вёска вырвалася са свайго незразумела якога існавання і адчула, што свет не замыкаецца мястэчкам, каровамі, свіннямі, што ёсць яшчэ іншае — галерэя Ады, свет мастацтва і прыгожага, які ўказвае чалавеку на яго годнасць і вялікасць паклікання на гэтай зямлі, і што будзённае і шэрае можа быць прыгожым. Трэба гэта толькі зразумець.

Алесь АДАМКОВІЧ

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Упраўленне адукацыі Заводскага раёна горада Мінска

ДЗЯРЖАЎНАЯ УСТАНОВА АДУКАЦЫІ

Гімназія № 14 г. Мінска

Беларускамоўнае навучанне ў Беларусі — з’ява хутчэй выключная, чым звычайная. Асабліва гэта тычыцца буйных гарадоў. Так званае „раўнапраўе” рускай і беларускай моў звяло апошнюю да стану ледзьве не мёртвай латыні. Як лацінскую мову выкарыстоўваюць у паўсядзённым жыцці хіба толькі ўрачы ды ветэрынары з батанікамі, так і беларускую — некаторыя пісьменнікі ды так званыя „свядомыя” (вымаўляецца грэбліва-іранічна, каб дыстанцавацца ад беларускамоўнай дэмакратычнай апазіцыі).

Праўда, у Мінску сям-там яшчэ можна знайсці нешматлікія і невялікія астраўкі беларускамоўнай адукацыі. Зразумела, ідзе не аб універсітэты ці акадэміі, але сярэднія школы, некаторыя з якіх называюцца гімназіямі. Аб адной з такіх — мінскай гімназіі № 4 — „Ніва” распавядала ў ліпені 2007 года ў 26 нумары газеты. Цяперашні аповед пойдзе аб падобнай гімназіі № 14, што месціцца ў Заводскім раёне беларускай сталіцы, а дакладней — аб сайце гэтай навучальнай установы.

Месца гімназіі ў сусветным павуцінні знаходзіцца па адрасе http://gymn14.minsk.edu.by, і па ўсім відаць, што сайт гэты перажывае далёка не лепшыя часы свайго існавання. Вялікія белыя прасторы зверху і знізу ад асноўнага выяўлення адштурхоўваюць ад далейшага віртуальнага азнаямлення з гімназіяй. Адзінае, што прыцягвае ўвагу і ўзбуджае зацікаўленне, гэта „сардэчнае запрашэнне ў адзіную ў Заводскім раёне г. Мінска беларускамоўную гімназію № 14”. Выключна гэтыя словы прымушаюць круціць кола мышкі і клікаць на рубрыкі сайта данай гімназіі.

Першае, што падаецца незразумелым пасля „адзінай беларускамоўнасці сярод гімназій Заводскага раёна”, гэта розныя абвесткі і навіны, змешчаныя ў самым нізе выяўлення. Усе яны чамусьці напісаныя на рускай мове. Няўжо беларуская мова настолькі далёкая ад жыцця нават у гэтай гімназіі, што на ёй можна толькі распавядаць пра прыметнікі і дзеясловы, аксіёмы і тэарэмы, а павіншаваць пераможніц конкурсу прыгажосці ўжо ніяк нельга?!

Але вернемся да „Мяню” (як напісана на галоўнай старонцы) сайта. У першай рубрыцы распавядаецца аб гімназіі. Тут нас чакае не надта прыемны сюрпрыз — рубрыка адкрываецца даволі доўга. Праўда, інфармацыя, што змешчана там, згладжвае гэтае адмоўнае ўражанне — у гімназіі разнастайнае навучанне. Тут школьнікі пачынаюць вучыць англійскую мову яшчэ ад падрыхтоўчага класа, а падчас навучання ў гімназіі ім прапануецца авалодаць на выбар нямецкай, польскай ці сербскай мовай. Ёсць у школе спецыяльныя курсы па міфалогіі, псіхалогіі, асновах эканамічных ведаў, журналістыцы.

Наступнай, найбольш цікава пададзенай рубрыкай на сайце з’яўляецца „Бібліятэка”. „О, колькі ў гэтым доме кніг, /Уважлівей углядзіся — /Тут тысячы сяброў тваіх /У шафах улягліся”, — распавядаецца на старонцы, аздобленай разнастайнымі фотаздымкамі. „Сябры, што ўлягліся ў шафах” дапамагаюць настаўніцкаму калектыву праводзіць пазакласныя мерапрыемствы — ладзіць сустрэчы з пісьменнікамі і рыхтаваць навучэнцаў да перамог на розных конкурсах.

Па ўсім відаць, гімназія № 14 — даволі добрая, асабліва, калі зважаць на яе шматмоўнасць. Вось толькі сайт пакідае жадаць лепшага.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

СПОРТ

Узяць быка за рогі

Мінулы 2008 год для беларускага спорту, нягледзячы на шэраг допінгавых, алкагольных і фінансавых скандалаў, быў адным з найбольш паспяховых у суверэннай гісторыі. Якім будзе надышоўшы 2009 год, тым больш у варунках сусветнага эканамічнага крызісу, прагназаваць цяжка. У пэўным сэнсе ён мусіць быць больш спакойным, бо год не алімпійскі, а значыць з гледзішча спорту прамежкавы і не такі насычаны. Але сумаваць, канешне, не давядзецца.

Першымі ў год Быка скруціць гэтую жывёліну за рогі прадстаўляецца шанц беларускім валейбалістам. Мужчынская зборная пад кіраўніцтвам Аляксандра Сінгаеўскага гэтымі днямі праводзіць матчы адборавага цыкла чэмпіянату свету 2010 года. Сапернікамі нашых у першым раўндзе сталі Ізраіль і Вялікабрытанія. Таго з трыо, хто выйграе турнір на Туманным Альбіёне, чакае працяг адбору на другім этапе. Па логіцы рэчаў Беларусь павінна адолець першы бар’ер. А валейбалісткі ўжо дакладна паедуць на фінальны турнір еўрапершынства. На клубным роўні мужчынскі жлобінскі „Металург” у Кубку выкліку працягне змаганне ў 1/8 фіналу.

Няпростае выпрабаванне наперадзе ў гандбалістаў. Вясной яны прадоўжаць змаганне ў кваліфікацыі да першынства кантынента. У сакавіку нашых чакаюць рандэву ў Мінску з грознымі немцамі і выезд на матч з аўтсайдарам групы Балгарыяй. А ў чэрвені будуць вырашальныя бітвы з галоўнымі канкурэнтамі — славенцамі. У гэтым жа месяцы беларускія гандбалісткі пройдуць выпрабаванне камандай Румыніі ў стыкавых гульнях да чэмпіянату планеты. Жаночая баскетбольная зборная ўжо звычыла сваіх прыхільнікаў да гучных перамог, у чэрвені яна на еўрачэмпіянаце пастараецца захаваць высокія пазіцыі, якія пакуль толькі сняцца нашым баскетбалістам, якія сваім парадкам будуць прабівацца наверх.

Безумоўна ў цэнтры ўвагі заўзятараў будзе хакейны чэмпіянат свету, што пройдзе ў Швейцарыі. Там сапернікі нацыянальнай дружыны Беларусі на першым этапе — Канада, Славаччына і Венгрыя. Дадае інтрыгі той факт, што на чале беларусаў пасля трохгадовага перапынку павінен стаць харызматычны канадзец Глен Хэнлан. Значную цікавасць выклікае таксама ўдзел мінскага „Кераміна” ў фінальным розыгрышы Кантынентальнага кубка. Аматары хакея пільна і надалей будуць сачыць таксама за гульнёй квартэта нашых легіянераў у НХЛ — Руслана Салея, Міхаіла Грабоўскага, братоў Андрэя і Сяргея Касціцыных.

Пад асаблівым прыцэлам у 2009 годзе апынецца футбольны барысаўскі БАТЭ, які нарабіў шуму ў Еўропе. Прабіцца другі раз запар у асноўную сетку Лігі чэмпіёнаў клуба Анатоля Капскага і Віктара Ганчарэнкі будзе надзвычай цяжка. Не проста давядзецца барысаўцам і ў першынстве краіны, дзе рэваншысцкі настрой рыхтуе сталічнае „Дынама”, якое істотна ўзмацняецца.

Мала шанцаў на станоўчы зыход у адборавай кампаніі да чэмпіянату свету застаецца ў нацыянальнай футбольнай дружыны. З большым нецярпеннем будзе чакацца фінальны турнір моладзевага футбольнага чэмпіянату Еўропы, які пройдзе ў чэрвені ў Швецыі. Там сапернікамі па групе каманды Юрыя Курненіна стануць гаспадары форуму, Італія і Сербія. Можа быць другі ў гісторыі заход беларускай дружыны прынясе нашым маладым талентам сапраўдны поспех.

Аматараў спорту чакае і многа іншых турніраў у розных відах. Сапраўдных эмоцый і станоўчых зыходаў у Новым 2009 годзе!

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Табліца ў храме „Ойча Наш” у Палесціне на ўкраінскай мове

Каля святога горада Іерусаліма ўзвышаецца святая гара, якая называецца Елеонскай, ці Аліўнай, на якой паміж узвышшамі 326 і 333 св. Алена збудавала сабор. У гэтым храме, першапачаткова, адзначалася свята Узнясення Гасподняга. Пазней на верхавіне Аліўнае гары была ўзведзена царква. У XII стагоддзі крыжакі падчас сваіх паходаў у Святую Зямлю пабудавалі на гэтым месцы царкву пад назвай Pater Noster (Ойча Наш), якая мела быць сімвалам і напамінам пра вучэнне Ісуса Хрыста.

Працяглы час месцы, дзе былі сабора св. Алены і Pater Noster, заставаліся апусцелымі, пакуль у 1866 г. наваколле не набыла французская княгіня дэ ла Тур Аверньская і падаравала манахам ордэна кармелітаў. Зараз тут месціцца царква Pater Noster.

На мурах ганка царквы можна ўбачыць вялікія табліцы, на якіх відаць тэкст малітвы на розных мовах свету. У 1946 г. там з'явіўся адпаведны тэкст па-ўкраінску. Рэч у тым, што ў міжваенны час у Палесціну прыехала грамада ўкраінцаў, сярод якіх былі прадстаўнікі інтэлігенцыі. У 1942-1943 гг. у Палесціне з'явіліся польскія жаўнеры з Польскага Войска пад камандаваннем ген. Уладыслава Андэрса. У ліку вайскоўцаў апынуліся, таксама, беларусы і ўкраінцы. У выніку рэарганізацыі вайсковых аддзелаў частка жаўнераў была звольнена. Колішнія вайскоўцы аселі ў Палесціне на сталае жыхарства. Сярод апошніх апынуўся і Павел Міхайлавіч Базылеўскі. У хуткім часе ён ачоліў украінскую грамаду ў Іерусаліме. Па ініцыятыве мясцовых украінцаў было вырашана ўстанавіць табліцу з тэкстам малітвы на ўкраінскай мове. Неўзабаве згаданая табліца была ўмуравана ў скляпенне каля ўваходу ў царкву. Асвячэнне гэтай табліцы адбылося 6 кастрычніка 1946 г. у выкананні грэка-каталіцкага духоўніка Уладзіміра Фляка, які на той час быў студэнтам тэалогіі ва Універсітэце ў Бейруце. Урачыстасць адбылася ў прысутнасці шаснаццаці асоб, пераважна праваслаўнага веравызнання. Сярод прысутных, апрача чатырох міжваенных украінскіх эмігрантаў, астатнія паходзілі з польскіх грамадзян, якія трапілі ў Палесціну разам з Польскім Войскам ген. У. Андэрса.

Ніжэй варта пералічыць некаторых удзельнікаў асвячэння ўкраінскай табліцы.

Павел Базылеўскі, ураджэнец Палтаўшчыны, удзельнік I сусветнай вайны, былы афіцэр узброеных сілаў УНР Сымона Пятлюры. У міжваенны час разам з сям'ёй жыў у Беластоку. Памёр у Лондане ў 1985 г. Меў ранг генерала. Пакінуў кароткія ўспаміны.

Уладзімір Фляк, грэка-каталік, паходзіў з Галіччыны. Быў студэнтам-семінарыстам у Львове. Падчас II сусветнай вайны прадоўжыў навучанне на тэалагічным факультэце ва Універсітэце ў Бейруце.

Расціслаў Галуўка быў родам з Крамянца на Валыні. Падчас знаходжання ў Палесціне быў у польскай юначай школе кадэтаў. Памёр пасля вайны ў Англіі.

Хведар Лашук, родам з Валыні. Пасля заканчэння вайны эміграваў у Венесуэлу.

Міхась Швэдзюк, беларус, нарадзіўся на Піншчыне. У Палесціне апынуўся разам з Польскім Войскам у якасці кадэта юначага корпуса.

Іван (прозвішча невядома), беларус з-пад Кобрына. Пасля вайны жыў у Аўстраліі.

Зараз нам складана адказаць ці хтосьці з прысутных на той урачыстасці напісаў адпаведную зацемку альбо артыкул ва ўкраінскай прэсе. У сувязі з гэтым я, як удзельнік асвячэння ўкраінскамоўнай табліцы ў царкве Pater Noster, а таксама добры знаёмы са святой памяці Паўлам Базылеўскім ды іншымі там прысутнымі ўкраінцамі, палічыў за абавязак напісаць гэтую ўзгадку з той мэтай, каб памяць пра дадзеную падзею цалкам не адышла ў нябыт. Шчыра спадзяюся, што гэтая інфармацыя будзе цікавай і карыснай для многіх чытачоў, а перш за ўсё для ўкраінскіх даследчыкаў.

Міхась ШВЭДЗЮК
(Вялікабрытанія)

Падманлівыя фірмы

Пры камуне ў крамах можна было сустрэць лозунг „Кліент наш пан”. Зараз кліента маняць рэкламнымі абвесткамі ў сродках масавай інфармацыі ды на ўсялякага роду прамоцыях. А як гэта выглядае на практыцы?

У чэрвені г.г. заключыў я дамову з фірмай „Эксатэль”, якая аб'ядналася з польскай энергетыкай. Прадстаўнік, які афармляў дамову, тлумачыў, што кліенты іхняй фірмы будуць мець ільготы пры аплатах за электрычнасць. Для гэтага дастаткова прад'явіць дамову інкасатару, які будзе запісваць паказанні лічыльніка. Хоць я скрупулёзна трымаўся ўказанняў прадстаўніка „Эксатэля”, то пры атрыманым рахунку за электраэнергію ніякіх ільгот не прыкмеціў. Пазваніў я ў Бельскую ПГЭ (Польская група энергетычная) — у аддзяленне абслугі кліента ды папрасіў высветліць справу. Чыноўніца адказала, што яны аб ніякіх ільготах не ведаюць, затым адказ шукаць трэба ў тэлекамунікацыйнай установе. Паслаў я па электроннай пошце заяву ў фірму „Эксатэль”. Неўзабаве атрымаў адказ: „Szanowny Panie, uprzejmie informuję, że EXATEL nie oferuje zniżek na energię elektryczną. W tej sprawie należy skontaktować się z dostawcą energii. Z poważaniem Agata Borzyńska”. І каму тут, даражэнькія, верыць? Выходзіць, што прадстаўнік „Эксатэля”, рэкамендуючы паслугі сваёй фірмы, упусціў мяне ў маліны...

З Лічбавым Польсатам я меў калатнечу ў мінулым, але здавалася, што фірма не допусціць чарговых памылак. Памыліўся. 22 верасня аглядаў я тэлесерыял, калі на экране нечакана з'явіўся надпіс: „Сігнал заблакаваны. Кантактавацца з аператарам”. І пачалася каніцель... Пазваніў я пад указаны нумар, а там адазваўся аўтаадказчык (перад тым вымушаны я быў выслухаць некалькі мінут музыкі і рэкламу Лічбавага Польсата). Афіцыйна атрымаў інфармацыю, што адключылі сігнал па прычыне неаплачанага абанемента. Пазваніў я ў банк, які займаецца рэалізацыяй маіх плацяжоў. У адказ пачуў, што аплата пералічана тэрмінова. Чарговы раз чакаю спалучэння з бюро абслугі кліента Лічбавага Польсата. Затраціў больш дзесяці мінут, каб пачуць ад кансультанта, што абанемент аплачаны, адно карту дэкодэра трэба памяняць. І пачалося інструктаванне як мяняць карту (раней атрымаў такую па пошце). Затраціў пры гэтым чарговыя дваццаць мінут. Праўда, у адрас кансультанта паслаў я некалькі злосных эпітэтаў, але міленькі жаночы голас у трубцы хваліў мяне, што хутка спраўляюся і ўсё будзе ў належным парадку. Пасля абмену карты кансультантка сігнал падключыла. У выніку гэтай размовы я затраціў больш паўгадзіны часу з аднаразовым рахункам тэлекамунікацыйнай фірмы на суму 7,81 зл. Не стаў я даходзіць сваіх правоў, бо палічыў, што шкада нерваў і часу. Вось як зараз фірмы дбаюць пра кліента.

Уладзімір СІДАРУК

Адгаданка

1	2	3	4	5	6	7	8					
9	10	11	12	13	14	15	16	17	18	19		
20	21	22	23	24	25	26	27	28	29	30	31	32

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — сербскую пагаворку.

1. духмянасць = 11 _ 17 _ 14 _ 15 _ 16 _;
2. спадарожніца Садома = 26 _ 27 _ 4 _ 25 _ 24 _ 23 _;
3. навука падапечная Кліо = 18 _ 19 _ 21 _ 22 _ 1 _ 10 _ 2 _ 3 _ 8 _;
4. змацоўвала хамут з аглоблямі = 28 _ 30 _ 31 _ 32 _;
5. Эдэм = 29 _ 12 _ 13 _;
6. Майсеева гара = 7 _ 20 _ 9 _ 5 _ 6 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 49 нумара

Звярынец, Одын, май, боб, вярба, армада, маг, бас, Улашчык, Чыкага, міф, змяя, Кім, снарад, Куба, пута, матыў, серабро.

Рашэнне: **Не давярай бычыным рагам, сабачым зубам і конскім капытам.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca.

Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH” i „KOLPORTER” na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 26 zł., półrocznej — 52 zł., rocznej — 104 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy” w 2009 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,65 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.

Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa”,
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 660 egz.

Самі гналі, каб пражыць

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Велікаватая вёска гарадскога тыпу, з сем кіламетраў ад гміннага мястэчка. Пасярод раздарожжа — два крыжы, праваслаўны і каталіцкі. Было ўсяго, кажа баба Геня, як то па нашых вёсках. Гінулі людзі і без вайны. Цяпер сядзім у яе драўлянай акуратнай хатцы абшытай белым сайдынгам. Баба Геня, старэнькая, але з элегантнай завіўкай на сівай галаве, сядзіць на ляжайцы. У новых хатах у С. ужо цэнтральнае ацяпленне робяць. У бабы Гені яе багаты, санавіты сын парабіў усё ў хаце па-сучаснаму, з лазенкамі-туалетамі ў будынку, але маці не дала змяніць печаў. У хаце мусіць быць пліта, і хлебная печ, і абавязкова цёплая ляжайка. Баба Геня, перажыўшая вайну, „старая партызанка", як на яе кажуць суседзі, не хоча ўспамінаць ваеннага і пасляваеннага часу, у якой рознае адбывалася пад рознымі крыжамі.

Фота Ілоны КАРПЮК

Нядаўна выдала замуж апошнюю ўнучку. За каталіка. Добры чалавек, здаецца. А цяпер мы сядзім у бабы Гені, бо ў вёсцы імпрэза. Бабе Гені ўжо па імпрэзах хадзіць не хочацца, дык сёння мы зробім тут паправінкі. Баба Геня частуе нас вясельнымі астаткамі, налівае чарку.

— Купная. А калісь мы самі рабілі. Мусілі навучыца, каб выжыць. Але ж і судзілі нас, о-го-го!

— Тут каля Чорнай-Беластоцкай, дык такія багны былі! — мяркуе бабуліна сваячка, якая гэтых славутых багнаў і бачыць не бачыла, не то што на іх каб бывала.

— За тое, што нас засудзілі, дык я магла выкупіць тры аўтамашыны! — матае галавой бабуля. — І пасядзела б! Суседка заўдала мяне. У яе знайшлі самагонку, дык сказала, што ў мяне купіла. Сачылі за мной год, аж урэшце злавілі мяне за руку. Калі б не дзед, ды паспела б схаваць, але ён, пакуль злез з печы... Страшэнным штрафам мяне пакаралі. Мусіла на фабрыцы браць пазыку, каб аплаціць. Яшчэ і сядзець мне месяц засудзілі, але суддзя пераклаў тое на грошы. Гэта ўжо за саветаў было...

— Жыць тады можна было, — прыгадвае баба Геня і рэжа каўбаску пальцам напіханую. — Гарэлкі нагоніш, і працы было многа. Можна было жыць. Пасля шмат з нашых вывезлі, у „Расію". Пасля вярнуліся некаторыя. І за немца мы гналі. Кругом нашага хутара — лес. Мае браты заснавалі проста фабрычку, якую змеханізаваную! Наляцелі на нас, — браты мае ўцяклі, забраўшы нагнаную гарэлку. Адно вада ўжо цякла з апаратуры. Я адна асталася. Рукі ўверх! — немцы да мяне. Мяне пабілі, прабавалі разбіць цэлую апаратуру. Ды якая моцная была! Кулі яе не бралі! Пастралялі фашысты ў яе, і пакінулі. Пасля мы з імі дамовіліся: кожныя два тыдні насілі гарэлку з маёй браціхай. Занясем, а яны загадваюць піць яе з імі разам. Сярод гэтых немцаў быў адзін файны хлопец, іншыя — старыя дурні. Мая браціха была харошай кабеткай, ды як тыя нямчуры ўчэпяцца да яе! Ну, вазьмі і выжыві: з аднаго боку немцы, а ў лесе — партызаны. Невядома хто на цябе выйдзе. Каб апісаць нашы перажыванні з таго часу — тоўстая кніжка выйшла б! Ды каго можа цяпер гэта і цікавіла б! Такі... „забытак".

— З чаго гналі? З цукру, з бульбы. Нават з мукі гналі, жытняй. Стаяла гэта ў вялікіх скрынях. Пасля тое студзілі. О, якраз такі апарат стаяў, рыхтык як гэты ў „Ніве", — паказвае баба Геня на тэкст пра самагонаварэнне ў Белавежскай пушчы. — Праца была не такая і лёгкая, бо і ўварыць усё тое трэба было, і з бутлямі нанасіцца.

Баба Геня частуе нас агурочкамі, крыху прывялымі пасля сямейнай імпрэзы, і салаткай пад маянэзам. Хата яшчэ поўніцца гэтым салаткава-агурочна-вінным пахам.

Баба Геня сама выхоўвала найменшую ўнучку, якую выдала замуж так як трэба — нарушыла цэлы жалезны запас ашчаднасцей. А гарэлка амаль уся была купная, ну, была і гарэлка ад „рускіх". Здаецца, сапраўдная, няхрышчаная, бо на бутлях была бандэроль. Каб суседзі не сказалі, што слабое вяселле было. Маладыя не вельмі хацелі, магла бабця даць грошы проста ім у рукі, але не магло быць так, каб сказалі ў вёсцы, што сваю ўнучку-паўсіротку выдала абы-як. Аде і так унучка беспрацоўная пакуль...

— О, а за саветаў работы то было! — зноў успамінаецца старушцы даўні час. — Не так, як цяпер. І хацелася працаваць. І моладзі добра было, бо ўсё было дарэмнае. Адно вучыся. І калі нашая, польская ўлада была, няма што наракаць, хоць усе цяпер плююць на „камуну". Пагадавалі мы дзяцей, павывучвалі. Хоць, вядома, такога панскага жыцця як *тэраз* не было. Не параўнаеш да таго жыцця, нашага, якое было калісь. А хто ў такое жыццё ўверыць, якое я перажыла? Калі б і фільм паставіць, — не паверыш. Засталіся мы, вось, старыя, яшчэ з рэнтамі ад „камуны". Тады хацелася і рабіць на фабрыцы, і гаспадарку весці, і свіней гадаваць... А зямлі мы ўсё ж не здалі!... І я вырабіла пенсію, і мой таксама. Мой, не скажу, працаваў як вол, але і любіў выпіць, так што рэдка дома і бываў, і ўсё было на маёй галаве. Далі рады выхаваць чацвёра дзяцей. Ужо я прабаба. Унукаў плойма, але пры мне адзін туліцца, вучань тэхнікума. Лянівы, выпіць любіць. Ужо ім не пакіруеш, бо ўжо не хоча нікога слухаць. Што ж зробіш, такое жыццё. А мы так удвое цяпер; мой на куляcках, на вазку, і я якась тэпаю. Нам з маім па восемдесят шэсць гадоў, гаспадары ўсё! Лазіць якась чалавек то туды, то сюды... Я адна мушу ўсё афармляць, рыхтаваць. Мы ж самі ўжо ж з гаспадаркай не далі б рады справіцца. Заплаціш — усё зробяць. А як бяруць найахвотней за работу — дасі пляшку, рабіць будзе...

11.01 – 17.01

(22.03. – 20.04.) У сардэчных справах пазбегнеш расчараванняў, калі будзеш ведаць, чаго хочаш. Не зловіць цябе чалавек, якога словы нічога не значаць. Дзякуючы інтуіцыі добра капіталаўкладзеш грошы, хоць у фінансах так хутка не дрыгне.

(21.04. – 21.05.) Калі хочаш дасягнуць мэты, старайся не ісці напрасткі. Выбіраючы, прымяняй такія развязкі якія ўзбагацяць цябе, прынясуць табе развой і адкрыюць поле да новага досведу. Не ўцякай перад сумам, бо і так мусіш яго перажыць.

(22.05. – 22.06.) Адкрываюцца перад табою шанцы на развой у амаль усіх сферах. Найбольшыя поспехі на працы. 11.01. некарысны час на пачатак новых мерапрыемстваў; не бярыся за стратэгічныя рашэнні, засяродзься на недароблены.

(23.06. – 23.07.) У час поўні Месяца 11.01. акдрыюцца табе вочы на тое, чаго дагэтуль не заўважаў. Час унутранага адраджэння, адкрыццё новага напрамку дзеяння. 14-18.01. — праблемы ў падарожжы, у фінансах. Не спяшайся, не ўспрымай усяго ўсур'ёз.

(24.07. – 23.08.) Да 14.01. дасканала спалучыш фантазію з практычнасцю, зрэалізуеш свае новыя ідэі. Не паддавайся ў выпадку цяжкасцей, бо ўзнагарода будзе вялікая! Хтось выпадкова можа табе ў чымсьці зашкодзіць, але хутка справа высветліцца і забудзецца.

(24.08. – 23.09.) 11.01. хтосьці зробіць табе мілы сюрпрыз, да таго такая асоба, па якой ты гэтага не спадзяешся. Будзеш жвавы і ахвотны наладжваць усё новыя кантакты. З 16.01. беспамылкова будзеш арыентавацца ў кожнай сітуацыі, выкарыстаеш кожную нагоду, каб папраўіць свой рэйтынг у прафесійным і асабістым плане.

(24.09. – 23.10.) Могуць сустрэць цябе на працы ці ў школе розныя прыкрасці або зласлівасць з боку асоб, якія зайздросцяць табе поспехаў. З вялікай свабодай будзеш гаварыць аб пачуццях. На працы не выручай калег у іхніх абавязках.

(24.10. – 22.11.) У сваіх дзеяннях выкажашся адчайнасцю. Дойдзеш свайго без цяжкасцей, але засяроджваючыся на найважнейшым. Пазбудзешся сваіх чорных думак, і пазбягай такіх людзей, якія з ахвотай увялі б цябе зноў у цяжкі настрой.

(23.11. – 22.12.) З 16.01. будзе біць з цябе аптымізм, адкрытасць і творчыя ідэі. Будзеш наватарскі і проста шалёны! Трымайся здалёк ад людзей, якія схочуць цябе абмежаваць. Пасля 11.01. лепш не паддавайся, калі не мусіш, медычным працэдурам.

(23.12. – 20.01.) Да 13.01. зрэалізуй свае мэты, афармі справы ва ўстановах. Добра ўдасца падарожжа. Можа крыху ўскладніцца ў пачуццях — з аднаго боку прагнеш блізкасці, з другога — свабоды. Самотны Казярог не будзе мець праблем з наладжаннем кантактаў.

(21.01. – 19.02.) Набіраешся ўпэўненасці, з кім хочах дзяліць свой лёс. Набярэшся аптымізму, возьмешся за рэалізацыю навагодніх абяцанняў. Поўня Месяца ў знаку Рака (11.01.) пакажа, на каго ў фірме можаш разлічваць, а хто не падасць табе рукі.

(20.02. – 21.03.) Зоркі гарантуюць табе красу, вабнасць, выкліканне сімпатыі ў кожнага, каго сустрэнеш. Усё ж, даведаешся, хто табе не спрыяе. Дбай пра тое, каб, калі схочаш, схавацца і пабыць аднаму. Поўня Месяца 11.01. пабудзіць цябе да любоўных адкрыццяў і да таго, каб больш дбаць пра сябе самога.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960